КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 37 (1163) 13 верасня 2014 г.

ВЕЛАПРАБЕГ ДА ДНЯ БІБЛІЯТЭК

Сёння і заўтра, акурат напярэдадні Дня бібліятэк нашай краіны, прафесіяналы гэтай сферы вырашылі правесці незвычайную сустрэчу ў фармаце велапрабегу. Асноўны яго маршрут праляжа ад кніжніцы да кніжніцы на тэрыторыі Барысаўскага раёна. Адпаведна, касцяк удзельнікаў сфарміраваны з супрацоўнікаў тамтэйшай Цэнтральнай раённай бібліятэкі імя І.Х. Каладзеева. Але чакаецца і прадстаўніцтва з іншых куткоў краіны. Так, сталіцу прадставяць работнікі Нацыянальнай бібліятэкі.

На здымку: супрацоўнікі бібліятэк Мінска Марына Важнік, Настасся Жарская (з сынам Янам) і Арцём Арцёменка рыхтуюць да велапрабегу сваіх "жалезных коней".
Фота Юрыя ІВАНОВА

"На маю думку": пяць пазіцый пра... С. 4 — 5

Тэма вакансій: **пра "чыстыя" і не толькі** С. 7, 12

У Магілёве мастакі абмеркавалі... С. 8 — 9

Якім стане лёс **"Мотальскіх прысмакаў"?** С. 10 — 11

УВАГА! / ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" / ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ІНДЭКС — 63875 ВЕДАМАСНЫ ІНДЭКС — 638752

Другі Фестываль мастацтваў нашых суайчыннікаў доўжыцца ў сталіцы і не толькі

У Мінску ўжо другі дзень праходзяць мерапрыемствы II Фестывалю мастацтваў беларусаў свету. Як паведамляла ўжо "К", сёлета паўдзельнічаць у маштабным форуме прыехалі каля 250 гасцей з 18 краін свету. Напрыклад, сапраўдным адкрыццём для публікі стануць выступленні творчай вакальнай групы іспанцаў, якія спяваюць на беларускай мове і захоўваюць традыцыі беларускай народнай творчасці, а таксама ансамбля "Славянская душа" з французскага Ліёна.

З творчымі дасягненнямі суайчыннікаў, якія сёння пражываюць у іншых краінах, яшчэ можна пазнаёміцца і сёння, і заўтра. У выхадныя артысты будуць радаваць жыхароў ды гасцей сталіцы пад час канцэрта-падарунка Мінску на адкрытай пляцоўцы каля Палаца спорту, а таксама ў Белдзяржфілармоніі і выступяць з канцэртамі ў аграгарадках Мінскай вобласці. Спецыяльна да фестывалю прымеркаваны фотавыстаўка ды розныя экспазіцыі. Для ўдзельнікаў форуму прадугледжана экскурсійная праграма, якая ўключае, у тым ліку, наведанне Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, а таксама прагулкі па гістарычных мясцінах Мінска. Акрамя таго, у рамках фестывалю пройдзе пятае пасяджэнне Кансультатыўнага савета па справах беларусаў замежжа пры Міністэрстве культуры Беларусі. Карэспандэнты "К" напярэдадні міжнароднага форуму распыталі гасцей свята аб тым, як яны пачуваюць сябе на беларускай зямлі, чым жывуць, пра што мараць, і, канешне ж, пра тое, з якімі творчымі калектывамі завіталі на Беларусь...

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ, Алег КЛІМАЎ

У нумар!

Беларусы свету сустрэліся ў Мінску

Уладзімір ШУГЛЯ, ганаровы консул Беларусі ў Цюмені (Расія), старшыня абласной грамадскай арганізацыі "Саюз — інтэграцыя брацкіх народаў", член Праўлення Савета грамадскага камітэта "Саюз":

— Сам я — беларус. Нарадзіўся ў сям'і вайскоўца. Бацькі часта пераязджалі з гарнізона ў гарнізон па ўсім былым Савецкім Саюзе. Таму, нягледзячы на тое, што бацька мой родам з Барысава, а маці — з Гродзенскай вобласці, я нарадзіўся ў Расіі. Але заўсёды лічыў сябе беларусам, як і сваіх сыноў. Вельмі рады, што зноў завітаў сюды, на сваю далёкую радзіму, а яшчэ больш рады, што калектыў з Вікулаўскага раёна Цюменскай вобласці Расіі паўдзельнічае ў II Фестывалі мастацтваў беларусаў свету!.. Справа ў тым, што менавіта ў гэтым раёне дасюль захаваліся кампактныя паселішчы беларусаў і побыт іх застаўся практычна нязменным — нават пасля таго, як у Сібіры выраслі цэлыя пакаленні тых, хто ніколі не бываў на сваёй гістарычнай радзіме... Яны дасюль спяваюць беларускія народныя песні, памятаюць традыцыі сваіх продкаў і навучаюць ім моладзь... Дарэчы, захаваліся тут і абрады. Напрыклад, у вёсцы Асінаўка Вікулаўскага раёна адбываецца абрад пераносу абраза "Свечка". Так што памяць аб продках жыве на Цюменшчыне да сёння... І будзе жыць яшчэ вельмі-вельмі доўга... Я ў гэтым перакананы...

Любоў БОГНАТ, старшыня грамадскага аб'яднання "Культурны цэнтр "Беларусь" (г. Паўладар, Рэспубліка Казахстан):

— Я сама — дачка ўраджэнца вёскі Нячатава Столінскага раёна Брэсцкай вобласці. Мае бацькі прыехалі ў Казахстан у час так званага падняцця цаліны, там і аселі на ўсё жыццё. Але ж ніколі не забываліся на тое, адкуль яны родам. Дарэчы, сёлета спаўняецца роўна 105 гадоў з часу першага пасялення беларусаў на казахскай зямлі... Падзея, пагадзіцеся, знакавая, таму і будзем пра яе казаць на II Фестывалі мастацтваў беларусаў свету. А ў госці мы прыехалі са сваім калектывам "Світанак" — будзем прадстаўляць на суд гледачам свае танцавальныя і вакальныя нумары. Дарэчы, грошы на касцюмы атрымліваем з абласнога бюджэту свайго краю...

Працяг артыкула **чытайце на старонках 2 — 3.**

Сярод тых, каму 11 верасня Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды, — шэраг **дзеячаў культуры і мастацтва**.

Віншаванне!

Паважаныя сябры!

Сардэчна віншую з Днём бібліятэк!

Сёння, у эпоху высокіх тэхналогій, адкрытай інафармацыйнай прасторы, супрацоўнік бібліятэкі адыгрывае прыкметную асветніцкую ролю, з'яўляючыся адначасова праваднікам у свеце лічбавай інфармацыі і захавальнікам традыцыйнай кніжнай культуры.

Ваша місія застаецца запатрабаванай на працягу многіх гадоў, дзякуючы высокаму прафесіяналізму людзей, якія нясуць у сваіх сэрцах любоў да сваёй справы, павагу да кожнага, хто прагне культурнага ўзбагачэння.

Прыміце словы падзякі за ўклад у распаўсюджванне духоўных каштоўнасцей беларускага народа, падтрымку і развіццё беларускай культуры.

Жадаю ўсім вам здароўя, міру, дабрабыту, поспехаў у вашай пачэснай і высакароднай справе на карысць квітнеючай Беларусі!

Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Барыс СВЯТЛОЎ

У нумар!

Беларусы свету

Другі Фестываль мастацтваў нашых суайчыннікаў доўжыцца ў сталіцы і не толькі

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

А падтрымка беларусаў, які жывуць у Казахстане, адбываецца як з боку мясцовых улад, так і з боку Міністэрства культуры Беларусі ды Цэнтра нацыянальных культур, за што мы ім шчыра ўдзячныя! Заўсёды з задавальненнем прыязджаю ў Беларусь, а ў сувязі з тым, што я яшчэ і адказваю за сувязь з грамадскасцю ў аддзеле ўнутранай палітыкі акімата горада Паўладара, гэтых паездак значна паболела, чаму я, безумоўна, вельмі рада!..

Вера СУГАК,
паэтэса, прадстаўнік малдоўскай дэлегацыі:

— Родам я з Баранавічаў, але ўжо сорак гадоў жыву ў Малдове. Радзіму, вядома ж, бясконца люблю, не забываю пра яе, бывае, і слязу пушчу, успамінаючы… Гэты другі фэст стане другім і для мяне як для яго ўдзельніка. Разам са мной малдоўскае мастацтва і, натуральна, беларускае прадставяць на ім людзі, якія маюць самае непасрэднае дачыненне да Беларусі: яны калісьці жылі, вучыліся ў нашай краіне! Гэта, напрыклад, спявачкі Маргарэта Івануш і Сняжана Карпей. У сілу розных абставін не змаглі прыехаць у Мінск мастак Вячаслаў Ігнаценка і фотамастак, культуролаг Ганна Мазур, якія ўжо неаднойчы наведвалі Мінск, але іх работы будуць выстаўляцца ў рамках Фестывалю мастацтваў беларусаў свету. Я ж буду чытаць свае вершы.

Нашы землякі з замежжа ля сталічнай Ратушы.

З хваляваннем чакаем сустрэч з землякамі, хочацца жывых зносін, а не праз Інтэрнэт! Хочацца наяве ўбачыць, як сёння жыве наша краіна, хоць, дзякуючы тэлеканалу "Беларусь 24", што транслююць у Малдове, мы ў курсе ўсіх падзей, якія адбываюцца тут. Хочацца паказаць, што мастацтва Беларусі жыве ды развіваецца і за яе межамі! Наша дэлегацыя плануе правесці перамовы аб кантакце паміж дзвюма дзяржавамі ў сферы культуры і мастацтва. Будуць і перамовы нават у сферы эканомікі. А яшчэ (прыадкрыю вам сакрэт) маюць адбыцца і сустрэчы на высокім узроўні, прысвечаныя хуткаму візіту беларускай урадавай дэлегацыі ў Кішынёў…

Алена БОНДАР,
прадстаўнік украінскай дэлегацыі:

— На фэсце хочам паказаць беларускую вышыўку, ручнікі, кашулі, створаныя членамі беларускай суполкі ў Львове. Яшчэ павінен быў прыехаць хор, але не атрымалася, — мо я штосьці выканаю сольна. Мы, тыя, хто нарадзіўся ў Беларусі ці мае да яе дачыненне па лініі блізкіх сваякоў, у прадчуванні зносін з радзімай. Быццам бы і жывём зусім побач, але пакуль мінеш усе межы ды мытні, здаецца, што Беларусь і Украіна знаходзяцца ў розных канцах свету… Людзі ва Украіне не вельмі добра ўяўляюць, як і чым жыве сёння беларускі народ. Вядома, будзем размаўляць з дыяспарамі іншых краін: нам цікава, як яны захоўваюць беларускія традыцыі…

Іна САЛАЎЁВА,
прадстаўнік іспанскай дэлегацыі:

— У склад нашай дэлегацыі ўваходзяць дзесяць карэнных грамадзян Іспаніі і я. Ужо дваццаць гадоў жыву ў гэтай паўднёваеўрапейскай краіне, а нарадзілася ў Віцебску. Працую ў рускай школе пры расійскім пасольстве ў Мадрыдзе. Пры ёй дзейнічае гурток, дзе і мясцовыя жыхары могуць далучыцца да культуры славянскіх краін, у тым ліку

Зваротная сувязь: рэплікі і каментарыі

Сонечная дзяўчынка

Вольга БРЫЛОН,
музыказнаўца Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Беларусі імя Іосіфа Жыновіча:

— Я не памятаю Наташу Салаву без усмешкі на твары. Гэтая адкрытая ўсмешка заўсёды была яе візітоўкай і адразу выклікала незвычайную прыхільнасць ды сімпатыю да гэтай сапраўды сонечнай дзяўчынкі. Яе любілі за лёгкі характар, добразычлівасць і чысціню, што яна нязменна выпраменьвала. За вялікі талент, якім надзяліла яе прырода, за голас, што адразу ж браў у палон і ўжо не адпускаў са сваёй чароўнай прасторы… Ён, гэты незабыўны голас, скараў і захапляў з першых жа хвілін, як толькі яна пачынала спяваць.

Цягам дзесяці гадоў Наташа Салава была вядучай салісткай Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Беларусі імя Іосіфа Жыновіча пад кіраўніцтвам народнага артыста Беларусі Міхаіла Казінца. Прыйшла туды зусім яшчэ дзяўчынкай, без аніякага досведу працы на прафесійнай сцэне. Але за дзесяцігоддзе цалкам апраўдала давер, што аказаў ёй маэстра Казінец. І ніколі не падвяла свайго "хроснага" — музыканта і дырыжора Аляксандра Крамко, які літаральна за руку прывёў Наташу ў аркестр, пачуўшы яе выступленне на Рэспубліканскім конкурсе "Галасы Бацькаўшчыны-2004", дзе яна стала пераможцай. Разам з аркестрам Наталля Салава выступала на самых прэстыжных канцэртных пляцоўках Беларусі, і перш за ўсё — на сцэне Беларускай дзяржаўнай філармоніі, прадстаўляла разам з аркестрам Рэспубліку Беларусь у Расіі, Польшчы, Украіне. І заўсёды пакідала незабыўныя ўражанні ў публікі сваёй летуценнасцю, нейкай асаблівай цнатлівасцю аблічча ды кранальнай прыгажосцю голасу…

Наталля Салава пад час канцэрта. / Фота Андрэя СПРЫНЧАНА

Некалькі апошніх сезонаў Наташа Салава працавала ў складзе казачага ансамбля "Бацька Атаман", з якім таксама шмат гастралявала па Беларусі і за мяжой.

І вось Наташы не стала… У гэта немагчыма паверыць, розум адмаўляецца прыняць гэтую трагічную вестку, што стала сапраўдным ударам для ўсіх нас, яе сяброў. Мала сустрэнеш творчых людзей, якіх безагаворачна любяць усе. Наташа — менавіта такая. У яе нават не было нядобразычліўцаў, усе ставіліся да яе з любоўю і сімпатыяй. Дый як можна было па-іншаму ўспрымаць гэтую адкрытую, кранальную ў сваёй шчырасці і чысціні дзяўчынку?.. Яна ўтойвала, што хварэе, мужна змагалася з хваробай ды верыла, што зможа яе адолець…

Не атрымалася.

Без маці застаўся яе чатырохгадовы сынок Макар. Без прыгажуні-жонкі — муж Саша, яе апора і надзейны тыл. Наташа не дажыла да свайго 30-годдзя літаральна чатыры дні.

Бывай, наша любімая дзяўчынка!..

"Берагіня" для вузкага кола, або Як прапагандаваць аўтэнтыку?" / № 34

Chan Kaishy:

"Стварыць грамадскі савет..." па вырашэнні пытання "Берагіні" — лічыць прадстаўнік Міністэрства культуры Беларусі... А як жа выкананне ранейшых рашэнняў, якія былі прыняты па "Берагіні"? Спачатку варта выканаць тое, што абяцалі, а потым — планаваць наступнае…"

"Патрэбны прафесіяналы з ідэямі" / № 34

Уладзімір Русаковіч:

"У свой час быў страх перад электроннай кнігай. Цяпер б'юць трывогу праз нястачу паперы для ўзрослых патрэб выдавецкай справы. І гэтак у кожнай галіне. Нават нафтавая прамысловасць у свой час баялася скарачэння нафтаспажывання праз рост вынікавасці рухавікоў і хімічнай прамысловасці. Усё складваецца наадварот. У камп'ютарнай галіне яшчэ большае дзіва. Сціскане звестак павялічылася ў стакроць, а смартфоны цяпер маюць памяць большую, чым у ранейшых суперкамп'ютараў".

Отдел культурных проектов. Центральная библиотека г. Барановичи:

"У апошні час вельмі часта гучыць пытанне: бібліятэка павінна абмежавацца функцыяй выдачы кніг ці ўсё ж стаць культурна-дасугавым цэнтрам? Мы цалкам згодны з Тацццянай: "Бібліятэка сёння — гэта тое месца, куды чалавек можа прыйсці і не толькі атрымаць кнігу, але і пагутарыць з аднадумцамі, пагуляць у настольныя гульні, паўдзельнічаць у конкурсе, падзяліцца ведамі ў якой-небудзь галіне, навучыць іншых ці навучыцца самому". Бібліятэка — гэта месца, куды можна прыйсці ўсёй сям'ёй, і не адзін раз, выпадкова, а, па рэкамендацыі сяброў, зноў і зноў. Менавіта так працуе ў нас "Дзіцячая пляцоўка". Самым малодшым "чытачам" няма і года, але, нягледзячы на тое, што ёсць велізарная колькасць цацак, дзеці заўсёды выбіраюць кнігі! Яны з задавальненнем разглядаюць карцінкі, слухаюць бацькоў або бібліятэкараў, якія чытаюць услых".

"Ідэі "Ля Белай Чаплі" / № 36

Наум Гальперович :

"Прачытаў: "…Увечары перад Лунінцом заехалі ў загадкавы Кажан-Гарадок"... Я ў гэты загадкавы Кажан-Гарадок заехаў упершыню ў 1975 годзе, бо гэта радзіма маёй жонкі. Тады яшчэ жывыя былі яе бабуля Тэкля, бацька Іван Георгіевіч і маці Зося Паўлаўна, малымі былі мае шуракі Васіль і Міхась, якім зараз за пяцьдзясят... Бакен на Прыпяці, муж цёткі Евы "Рыжы Валодзя"... Столькі ўражанняў, столькі падзей за гэтыя гады звязана з палескім вялікім сялом!.. Пасля Чарнобыля дзяцей ужо туды не вазіў. Дый неўзабаве цешчу перавёз на Полаччыну. Але хата тая на беразе Цны яшчэ стаіць, а на могілках у "Хвайках" — дагледжаныя ўсёй раднёй з Полацка, Піцера, Мінска помнікі бабулі і бацьку, куды мы прыязджаем штогод…"

КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ МАСАВА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА
Выдаецца з кастрычніка 1991 года

Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ

Сайт: **www.kimpress.by** E-mail: **kultura@tut.by**

Рэдакцыя
Адказны сакратар: Вольга НАВІЦКАЯ; **рэдактары аддзелаў:** Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецкарэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ; **загадчык аддзела фотаілюстрацый** — Юрый ІВАНОЎ; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД; **карэктар** — Інга ЗЕЛЬГІС.

Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41

Рэкламны аддзел: тэл. (017) 2860797, 334 57 41

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Культура і мастацтва" 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Прыёмная: (017) 290 22 50. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.

Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.

Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
*Матэрыял на правах рэкламы.

"Культура", 2014. Наклад 6001. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 12.09.2014 у 16.00. Замова 3726

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

З 11 верасня па лістапад у шэрагу гарадоў Літвы доўжацца мерапрыемствы **Дзён культуры Беларусі**.

сустрэліся ў Мінску

спеўнай. Мы прывезлі праграму, складзеную напалову з народных беларускіх ды іспанскіх песень. Іспанцам ніяк не давалася вымаўленне, было вельмі складана вывучыць мову, але душа, якая старалася спазнаць яе, перамагла! Да таго ж, іспанская і беларуская мовы вельмі падобныя па сваёй рытміцы, яркасці. Хвалюемся страшна!..

Жанна НІКІТЧУК,
прадстаўнік армянскай дэлегацыі:

— Я па адукацыі рэжысёр, скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў. Працую ў Армянска-беларускім гандлёвым доме "Ар-Бэ" ў Ерэване, а пры беларускай суполцы я арганізавала невялікі тэатр. Нашы пастаноўкі ўяўляюць з сябе песеннае дзейства, якое мы візуалізуем з дапамогай лялек. Беларуская грамада, на жаль, — адна з самых малалікіх у Арменіі, хоць існуе ўжо больш за шаснаццаць гадоў. Яна налічвае каля двухсот чалавек. Але ў Ерэване ёсць нядзельная школа, дзе дзетак, якія нарадзіліся ў змяшаных шлюбах, вучаць беларускай мове, гісторыі, знаёмяць з культурай. Дзейнічае творчы калектыў "Родныя карані", дзе спяваюць ды танчаць дарослыя і дзеці.

На фэсце я выканаю дзве песні: хутчэй за ўсё, гэта будуць "Родная мова" і "Цяче вада ў ярок". Фестываль — магчымасць апынуцца на роднай зямлі, глыбока ўдыхнуць паветра, якое па-іншаму пахне і па якім я сумую… На форуме мы хочам паглядзець, што беларусы, якія жывуць у іншых краінах, робяць для таго, каб іх карэнныя жыхары ведалі пра сапраўдную Беларусь, далучаліся да яе культуры…

Фота Юрыя ІВАНОВА

Перад пасяджэннем Кансультацыйнага савета інтэрв'ю дае міністр культуры Барыс Святлоў.

На прэс-канферэнцыі з удзелам дэлегацый беларусаў замежжа.

Пасяджэнне Кансультацыйнага савета.

ф о т а ф а к т

"Марат..." на "Белай вежы"

Учора ў Брэсце распачаўся чарговы Міжнародны тэатральны фестываль "Белая Вежа". Пачаўся ён са спектакля "Ханума" Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага. А сярод беларускіх пастановак на форуме, што сабраў калектывы з Эстоніі, Расіі, Украіны, Азербайджана, Італіі, Польшчы, Казахстана, Славакіі, Літвы, Арменіі, Латвіі, Грузіі, вылучаецца і работа саміх брэстчан: у фестывальнай праграме трупа прадстаўлена спектаклем Цімафея Ільеўскага "Мой бедны Марат...".

Фота з архіва тэатра

Увага! Аб'ява!*

Аб прэміях Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі 2015 года ў галіне літаратуры, мастацтва, журналістыкі і аматарскай творчасці

3 1989 года, раз у два гады, да Свята працы — 1 Мая, прысуджаюцца прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. За гэты час лаўрэатамі сталі 3 прафесійныя і 22 аматарскія калектывы мастацкай творчасці, 163 дзеячы культуры, мастацтва, журналісты.

28 жніўня 2014 г. прынята рашэнне аб умовах прысуджэння прэмій 2015 года. Іх будзе:

а) пяць прэмій у галіне літаратуры і мастацтва, у тым ліку:
за творы прозы, паэзіі і драматургіі — адна прэмія;
за музычныя творы, канцэртна-выканальніцкую дзейнасць — адна прэмія;
за работы ў галіне тэатральнага мастацтва і кінамастацтва — адна прэмія;
за творы жывапісу, скульптуры, графікі і прыкладнога мастацтва — адна прэмія;
за лепшы твор аб прафсаюзах (літаратурны, музычны, канцэртны, тэатральны, кінамастацкі, жывапісны, скульптурны і іншы) — адна прэмія;

б) адна прэмія за актыўную работу па развіцці народнага мастацтва і аматарскай творчасці працоўных (сярод кіраўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый, прафсаюзных і ведамасных устаноў культуры, старшынь прафсаюзных арганізацый);

в) адна прэмія за выдатныя дасягненні аматарскіх калектываў мастацкай творчасці;

г) адна прэмія ў галіне журналістыкі.

На саісканне прэміі ФПБ прымаюцца творы і работы, апублікаваныя, публічна паказаныя ці выкананыя за апошнія чатыры гады, але не пазней чым за 6 месяцаў да ўстаноўленага тэрміну вылучэння на саісканне прэміі. Не могуць быць прадстаўлены работы, якія адначасова вылучаны на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, міжнародных прэмій ці прэмій іншых дзяржаў, або якія ўжо атрымалі такія прэміі.

Колькасць саіскальнікаў на атрыманне прэміі ФПБ у складзе калектыву аўтараў не павінна перавышаць 4 чалавекі.

Вылучэнне работ і твораў на саісканне прэміі ФПБ праводзіцца на сходах працоўных калектываў прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў, пасяджэннях прэзідыумаў раённых, абласных і рэспубліканскіх камітэтаў і аб'яднанняў прафсаюзаў, калегій, прэзідыумаў і сакратарыятаў праўленняў органаў культуры, творчых саюзаў, міністэрстваў і ведамстваў Рэспублікі Беларусь.

Пры гэтым улічваецца абавязковае членства ў прафсаюзе кандыдата і яго ўдзел у рабоце прафсаюзнай арганізацыі, выбарных органаў прафсаюзаў і мерапрыемствах, якія праводзяцца прафсаюзамі, і да т.п.

Памер прэмій Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі 2015 года будзе ўстаноўлены пры прыняцці рашэння аб іх прысуджэнні ў красавіку 2015 г.

Дакументы і матэрыялы па вылучэнні работ і твораў на саісканне прэміі ФПБ прымаюцца да **10 снежня 2014 г**. Камісіяй па прэміях Федэрацыі прафсаюзаў (220126, г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 21, пакой 915).

Тэлефон для даведак: 203-95-83.

Намеснік старшыні Камісіі па прэміях ФПБ у галіне літаратуры, мастацтва, журналістыкі і аматарскай творчасці А.М.Суша

Будзем на сувязі!

Паважаныя чытачы!
Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах нумара.
Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77,
альбо на электронную скрыню kultura@tut.by,
тэлефануйце ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97,
абмяркоўвайце на
facebook.com/kimpressby, vk.com/kimpressby,
twitter.com/kimpressby
odnoklassniki.ru/group/52156879339702

Па пытаннях размяшчэння рэкламы ў газеце "Культура"
звяртайцеся па тэлефоне
+375 17 286 07 97
і па тэлефоне/факсе
+375 17 334 57 41 альбо
на электронны адрас
kultura@tut.by!

Кнігу Мікалая Чырскага **"Мінск і ваколіцы"** з экскурсійнымі маршрутамі, фактамі і гісторыямі прэзентавалі на гэтым тыдні.

Пантэон без радка ў Вікіпедыі

ТЭКСТ

Сяргей ХАРЭЎСКІ,
мастацтвазнаўца

Мяркую, наша нацыя ў сучасным разуменні завяршыла сваё фарміраванне пасля Чарнобыля. Тады на беларусаў выпаў адзін, супольны лёс. Але мы не паспелі яшчэ гэтага асэнсаваць. З таго часу змянілася амаль усё, што магло змяніцца, у тым ліку і ў культуры.

Нязменнымі ж застаюцца стэрэатыпы. Не змяніўся і наш нацыянальны канон, укладзены больш за сто гадоў таму, яшчэ ў першай "Нашай Ніве": родная вёска і матчына мова, дарагі лес і клятае балота, святая Вільня і старажытны Полацк... Але войны, глабальныя пераўтварэнні змянілі наш край. Да пачатку XXI стагоддзя большасць беларусаў жыла ў гарадах, балоты аказаліся зарукай здароўя, Вільнюс — сталіцай суседняй дзяржавы.

А з колішняга пантэону, запачаткаванага адраджэнцамі пачатку XX стагоддзя, з намі застаюцца Скарына, Дунін-Марцінкевіч ды Багушэвіч. Цягам стагоддзя пантэон напаўняўся імёнамі. Перадусім трыядай Купала — Колас — Багдановіч, чые творы ўвайшлі ў кожны дом, стаўшы здабыткам пакаленняў. Затым пантэон дапоўніўся Каліноўскім, постаць якога сёння — адзін з найярчэйшых вобразаў нашага мастацтва, па сутнасці — легенда нашай культуры.

Але мы выпусцілі з-пад увагі і многія імёны з мінуўшчыны, вартыя ўключэння ў наш новы, сучасны пантэон. Вось магілёўцы вяртаюць імя Казіміра Семяновіча — слыннага навукоўца-баліст ыка. Але чаму мы забыліся на асобу Ілы Капіевіча, стварыўшага той самы шрыфт, якім вы цяпер чытаеце гэтыя радкі? Не магу зразумець, чаму не шануецца ў нас геніяльны Іван Насовіч — выбітны лексікограф, фалькларыст і этнограф, аўтар тузіна кніг, стваральнік першага класічнага "Слоўніка беларускай мовы", без якога не існавала б феномену нашай літаратуры пачатку XX стагоддзя! Ягоны лёс знітаваны з усёй Беларуссю — ад Мсціслава да Маладзечна! Аднак да сёння так і не выдадзены рукапіс яго гістарычна-мемуарнай працы "Успаміны майго жыцця", няма помніка, вуліцы ягонага імя… За савецкім часам ён стаў "класава чужым", але што замінае сёння?..

Пасля Другой сусветнай вайны Беларусь ізноў змянілася непазнавальна. За апошнія семдзясят гадоў наша культура "набрыняла" новым досведам, імёнамі, з'явамі, шэдэўрамі. І мы зноў і зноў пераасэнсоўваем свае старадаўнія ды найноўшыя здабыткі. Як мастацтвазнаўца і гісторык архітэктуры бачу лепш тое, што трапляе ў сферу маіх зацікаўленняў.

Тут паказальная эвалюцыя стаўлення да здабыткаў архітэктуры. Яшчэ гадоў сорак таму ніхто не лічыў даваенную архітэктуру за помнікі, не кажучы пра культавае дойлідства дасавецкай пары, а сёння мы шануем і паваенную архітэктуру! Культавую ж мы не толькі сталі лічыць здабыткам, але і пачалі адкрываць старажытныя храмы.

> Напрадвесні нашай незалежнасці мы рынуліся шукаць свае імёны ці не за акіянам. Стала модным папулярызаваць творцаў Парыжскай школы — дзясяткі мастакоў, якія ў розны час пакінулі Беларусь. **Ды ў такім запале ці не забыліся пра тых, хто быў побач....**

Ды яшчэ "не даспелі" мы да шанавання памяці пра дойлідаў. А такія імёны, як архітэктар XVI стагоддзя, будаўнік Нясвіжа і Вільні Ян Франкевіч, яго сучаснік Тамаш Жаброўскі з Навагарадка, а таксама Ян Бэкер, Тодар Крамэр, Ян Глаўбіц, сёння забытыя… Хоць дастаткова адкрыць энцыклапедыю, каб пераканацца, што Глаўбіцу варта паставіць тузін помнікаў! Дзякуючы Віктару Чарнатаву мы ведаем пра Станіслава Шабунеўскага, які пабудаваў ледзь не палову колішняга Гомеля. Але чаму няма ягонага імя ў падручніках?

Да крыўднага мала нам вядома пра Льва Вітан-Дубяйкоўскага, стваральніка "беларускага нацыянальнага стылю"! Мы амаль забыліся (апроч, хіба, пінчан) пра тое, што Іван Жалтоўскі, які і стварыў у Маскве той самы стыль 1940 — 1950-х, — наш зямляк з Пінска. Але для фігуры такога маштабу гэтага, мяркую, замала… Як і для стваральнікаў вобразаў паваенных гарадоў: Міхаіла Асмалоўскага, Уладзіміра Караля, Георгія Заборскага…

Напрадвесні нашай незалежнасці мы рынуліся шукаць свае імёны ці не за акіянам. Стала модным папулярызаваць творцаў Парыжскай школы — дзясяткі мастакоў, якія ў розны час пакінулі Беларусь. Ды ў такім запале мы забыліся пра тых, хто заўсёды быў побач, напрыклад — Георгія Ніскага ды Яўсея Майсеенку, што не парывалі з родным краем! Але і вернутыя нам імёны мастакоў Аляксандра Ахола-Вало ці Уладзіслава Стржэмінскага яшчэ не сталі агульнавядомымі ды шанаванымі.

Калі ж пачаць нам тварыць хоць бы мастакоўскі пантэон нават выключна з тых імёнаў творцаў, якія звязаны толькі з Мінскам, то спіс асоб, чые таленты і ўнёсак у наш культурны даробак — неаспрэчныя, стане феерычным відовішчам! Зазірніце ў даведнікі ці пацікаўцеся ў Інтэрнэце, хто такія Юзаф Пешка і Юзаф Азямблоўскі, Фердынанд Рушчыц і Міхаіл Кікоін, Меер Аксельрод і Натан Альтман, Раман Семашкевіч… А дзе ў сталіцы памяць пра іх?

Мне падумалася пра тое, наколькі не цэнім мы людзей, якія яшчэ жывуць у рэальнай нашай памяці, на ўрачыстым адкрыцці выстаўкі "Лявон Баразна. Спадчына" ў Нацыянальным мастацкім музеі ў 2010-м. Менавіта Баразна, першы па вайне руплівец захавання гісторыка-культурнай спадчыны, быў першапраходцам у шмат якіх галінах мастацтвазнаўства, этнаграфіі, кніжнай графікі. А колькіх мастакоў, паэтаў і навукоўцаў ён натхніў! Але яму няма нават мемарыяльнай шыльды… Хоць бы на тым самым доме ў Мінску, дзе была ягоная майстэрня. І тут жа размяшчалася майстэрня Віктара Шматава — выдатнага мастацтвазнаўцы, жывапісца, аўтара больш як 400 публікацый. Шматаў першым адкрыў нам каласальныя пласты спадчыны! А ягоны ўнёсак у ратаванне даробку, што апынуўся ў забруджаных радыяцыяй раёнах, — неацэнны. Дый жывапісныя палотны Віктара Шматава, камарынца па пахожданні, "Пахаванне ў чарнобыльскай зоне", "У ваколіцах Чарнобыля", "Развітанне", "Горкія яблыкі", "Лёс" — адны з найярчэйшых дакументаў эпохі. Не станем таксама забываць, што менавіта Баразна і Шматаў вярнулі ва ўжытак мастацтва кніг Скарыны ды безліч феноменаў нашай культуры, якія мы сёння ўжо прымаем як належнае…

Як належнае, агульнапрынятае ўспрымаем і тысячы ўведзеных дэфініцый ды артыкулаў, што напісалі выбітныя, светлай памяці, даследчыцы Элеанора Вецер ды Валянціна Церашчатава. Але мы не толькі не парупіліся пра ўшанаванне іх памяці, але і нават пра хоць пару радочкаў у Вікіпедыі! Хоць мне бачыліся б і кнігі пра іх, і кінафільмы…

Мы шукаем па цэлым свеце імёны землякоў, гатовы спрачацца за іх, але не бачым, не помнім, не шануем тых, хто побач. І калі мы адродзім ды ўшануем памяць пра ўласных творцаў, мастакоў, навукоўцаў і архітэктараў, то наш Пантэон стане вежай, з якой мы будзем сведчыць найперш сабе, а затым цэламу свету пра моц, харастро і жыццядайнасць нашай культуры!..

Нагадаем, што "К" яшчэ з пачатку 1990-х вядзе тэму выбітных імён нашай культуры, у тым ліку — мастацкай. Таму публікацыі пра тых самых Рыгора Семашкевіча, Яўсея Майсеенку, Георгія Ніскага, Юзафа Пешку, Фердынанда Рушчыца, Міхаіла Кікоіна, Івана Жалтоўскага, спадзяёмся, дазволяць казаць, што для чытачоў газеты вернутыя імёны творцаў (у тым ліку — у сталай рубрыцы выдання "Вяртанне імёнаў") не прагучаць як невядомыя.

Мінск "зробяць" святы?



ТЭКСТ

Ігар ВУГЛІК,
кандыдат гістарычных навук,
дацэнт

Ці горад робіць гараджан, ці гараджане — горад. У першым выпадку гэта датычыцца гарадоў, дзе часта змяняецца насельніцтва за кошт мігрантаў з сельскай мясцовасці, у другім — калі гарадское насельніцтва гістарычна ўстойлівае. Трапляючы ў новы горад спачатку глядзіш на будынкі, а потым на людзей. У ідэале яны павінны стасавацца адно да аднаго, утвараючы непаўторны стыль, нават аўру горада, у якую цягне зноў, альбо наадварот. Тым больш гэта тычыцца сталіцы краіны, якая мо і не ўвасабляе квінтэсэнцыю культуры народа, але абавязана мець выбітнае аблічча.

Розныя сталіцы маюць сваю "стылістыку" жыхароў, якая можа падабацца ці не. Ды вось пакуль што гараджан як аб'яднанай супольнасці на аснове сацыяльнай, культурнай прыналежнасці са сваёй гарадской самасвядомасцю ў Мінску… няма. Асноўная рыса мінчан, якую адзначаюць замежнікі, — сур'ёзны і нават пахмурны выгляд твараў і адносна няяркая вопратка. Хто такі мінчанін, пакуль сказаць цяжка. Аднак гэта ў цэлым адпавядае і архітэктурнай стылістыцы. Мінск, які быў кардынальна перабудаваны ў пасляваенныя дзесяцігоддзі, плануўся як класічная савецкая сталіца з адпаведнай іерархічнай архітэктурай сталінскага ампіру, дзе галоўнае — шырокі, прыстасаваны для масавых дэманстрацый праспект з узорнымі жылымі дамамі і дамінуючымі дзяржаўнымі, грамадскімі будынкамі. Каб "ачалавечыць" такі горад, яго цэнтр, трэба, напэўна, як у Кіеве (дзе ў цэнтры на Крэшчаціку тая ж забудова), максімальна насыціць месцамі адпачынку, кавярнямі, лаўкамі, прадумаць адпаведную праграму (музыканты, цыркачы)…

У Мінску не склалася еўрапейская традыцыя грамадскага адпачынку з кавярнямі на свежым паветры ды зялёнымі газонамі, на якіх прыемна паляжаць паасобку ці з кампаніяй. Павільёны рэстаранаў і кафэ, вынесеныя за межы будынкаў, закрыты шклом і фактычна ізаляваны ад вольнага паветра. Піўныя загончыкі на тратуарах праспекта з іх спецыфічнымі супольнасцямі толькі падкрэсліваюць недарэчнасць шэрагу грамадскіх форм мінскага адпачынку. Сацыяльны, грамадскі "кавярнявы" дасуг у цэлым не даспадобы мінчанам. Затое шырока распаўсюджаны вясковы звычай сядзець на лавачках у дварах (аналаг старажытных прызбаў) каля дома, разглядваючы мінакоў. Так, напэўна, танней і па-свойску, бо кавярня — гэта ўжо іншая тэрыторыя, дзе свае правілы і непрадказальныя (бо кошты часта змяняюцца) рахункі. Грамадскі пачатак дасугу мінчан замыкаецца дваром дома і невялікім наваколлем, дзе можна сустрэць знаёмых, што ўтварае спецыфічныя анклавы па месцы жыхарства, якія прыйшлі на змену вясковым сваяцкім сувязям.

> На жаль, прыкметы сталічнай стылістыкі **прысутнічаюць толькі на цэнтральным праспекце — ад раёна Чыгуначнага вакзала да, прыкладна, парку Чалюскінцаў,** хаця...

Галоўная прычына складанага працэсу фарміравання мінчан як гарадскога, сталічнага соцыуму — частыя вялікія хвалявыя змены насельніцтва, якія пачыналіся на мяжы XVIII і XIX стст. (у сувязі з далучэннем да Расійскай імперыі), пачатку XX ст. (Першая сусветная вайна, рэвалюцыйныя змены), перыяд Другой сусветнай вайны, пасляваенныя дзесяцігоддзі, калі Мінск засяляўся выхадцамі з правінцыі. Прыток новых жыхароў — адметная з'ява сучасных вялікіх гарадоў.

...Галоўнае адрозненне сталічнай бытавой стылістыкі — адчуванне свайго сталічнага статуса гараджанамі і, натуральна, гонар за яго. У візуальнай прасторы, на жаль, прыкметы сталічнай стылістыкі прысутнічаюць толькі на цэнтральным праспекце — ад раёна Чыгуначнага вакзала да, прыкладна, парку Чалюскінцаў, хаця... Невялікі кавалачак Верхняга горада прэзентуе тое, што завецца ўласна еўрапейскім горадам.

Празмерны рост Мінска, яго падзел на горад ("Сіці") і спальныя раёны без належнай у першую чаргу сацыякультурнай інфраструктуры, адмоўна ўплываюць на станаўленне гарадскога, сталічнага соцыуму. Адзінае, што звязвае жыхароў спальных раёнаў і праспекта-цэнтра, — паездкі на працу, калі яна размешчана за межамі рэгіёна іх пражывання. Савецкая сістэма са сталіцай, дзе канцэнтруецца ўсё лепшае, і астатнімі рэгіёнамі па-за ёй павінна саступіць месца еўрапейскай сістэме самадастатковых невялікіх гарадкоў са сваімі ўніверсітэтамі, тэатрамі, вытворчасцю. Урэшце, і паволі саступае ў некаторых кутках рэспублікі.

Адметнасці Мінска і мінчан бракуе адсутнасць арыгінальных гарадскіх святаў, звячаяў, звязаных са старажытнай гісторыяй горада. Да XIX ст. ён не вызначаўся адметным культурным жыццём, саступаючы Магілёву, Віцебску, Полацку, Гродну, Нясвіжу, іншым гарадам Беларусі, таму трэба актуалізаваць падзеі старажытнасці. Патрэбны агульнагарадскія дзеі, якія маглі б аб'яднаць гараджан на аснове іх прыналежнасці да старажытнай гісторыі горада. Гэта могуць быць святы, прысвечаныя дакладнай гістарычнай падзеі — напрыклад, дню надання Мінску Магдэбургскага права (з урачыстым касцюміраваным шэсцем колішніх рамесных цэхаў, прадстаўнікоў гараджан у старажытных строях) ці міфалагічнай — выгнанню Менеска (тым больш, што можна знайсці месца яго млына на існаваўшым некалі прытоку Свіслачы).

Мінск павінен абраць свой стыль — сталічна-фанабэрысты, як Парыж, Берлін, Варшава, пачціва-строгі, як Рыга, Вільнюс, ці быць горадам-святам, сяброўскім і ветлівым, як Амстэрдам ці Кіеў (быў і, спадзяёмся, застанецца). Падаецца, што пакуль найбольш аптымальны шлях Мінска — да сталічнай стрыманасці і пэўнай дэмакратычнасці, якія з часам павінны перайсці ў еўрапейскую разняволенасць ды сталічную паважнасць.

Гэты тэкст культуролага Ігара Вугліка — дыскусійны. А якім мае стаць аблічча Мінска будучыні на вашу думку? А любога іншага беларускага горада з саліднай гісторыяй за плячыма? З іншага боку, меркаванне можа стаць і пэўным зыходным пунктам для мясцовых улад у пошуках таго, у якім кірунку змяняць аблічча гарадоў і мястэчак.

Будзем на сувязі!

Паважаныя чытачы!

Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах нумара.
Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77, альбо на электронную скрыню kultura@tut.by,
тэлефануйце ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97,
абмяркоўвайце на
facebook.com/kimpressby, vk.com/kimpressby, twitter.com/kimpressby
odnoklassniki.ru/group/52156879339702

Свята камернай музыкі **"Вяртанне Паўночных Афін"** плануецца правесці 25 верасня ў адрэстаўраваным Палацы Агінскага.

Музей фатаграфіі: крытэрый, гісторыя і "сок"

У беларускай фатаграфіі маецца адзін неаспрэчны козыр: яна — ёсць. Усе астатнія якасці, уласцівыя фатаграфіі як культурна-сацыяльнай з'яве, практычна адсутнічаюць.

ТЭКСТ

Валерый ВЯДРЭНКА,
фатограф

Больш дакладным будзе сказаць, што намінальна яны маюць месца. Ёсць плынь выставак, якія нікім не аналізуюцца, каб склалася агульная карціна фатаграфічнага руху. Ёсць мноства аўтараў, што, з'явіўшыся, знікаюць у невядомым кірунку. Ёсць нават знакавыя падзеі, дзе, праўда, прысутнічаюць адны і тыя ж імёны, і калі пытаешся ў тых "імёнаў", маўляў, чаму так, яны адказваюць: "Куратар выбраў…", а калі пра тое ж самае спытаеш у куратара, дык ён прамаўляе сакраментальнае "Я так бачу!".

У нас ёсць аб'яднанне "Фотамастацтва", якое занята папулярызацыяй фатаграфіі ў краінах СНД, нібыта ўласныя праблемы даўно вырашаны і мы можам падзяліцца досведам. Так, маем некалькі фотаальбомаў, якія не знайсці ў кнігарнях, за выключэннем краязнаўчых выданняў. У беларускай фатаграфіі ёсць свая гісторыя, якая нідзе не апублікавана, а замяняюць яе адасобленыя і неўпарадкаваныя артыкулы ў Інтэрнэце альбо самвыдаўскія тэксты. І, натуральна, у нас няма анталогіі беларускай фатаграфіі, дзе не выбарачна, а максімальна поўна было б прадстаўлена фотамастацтва, дзе можна было б відавочна ацаніць і сістэматызаваць гэтую з'яву як спецыялістам, так і шырокай публіцы.

Ды самае галоўнае — у беларускай фатаграфіі няма музея. А гэтая інстытуцыя, мяркую, вырашыла б калі не ўсе, дык вельмі многія пытанні нашай сферы, прынамсі, па дакументацыі, зборы, аналізе матэрыялу за дзесяцігоддзі. Гэта — натуральна, бо павінна быць адна такая ўстанова са сваім дахам над галавой, як у многіх з нашых суседзяў.

Пытанне "музейна-фатаграфічнае" ўжо ставілася неаднойчы, абмяркоўвалася яно і на старонках "К", узнімалася на ўзроўні міністра культуры. Праект (яго падрыхтавалі мы з Юрыем Васільевым), прадстаўлены на суд тагачаснага кіраўніка Міністэрства культуры краіны Паўла Латушкі, называўся "Беларусь у люстэрку трох стагоддзяў". Ён ахопліваў перыяд з часоў першых дагератыпаў, зробленых на нашай зямлі ці выхадцамі адсюль, і да найсучасных вопытаў з камп'ютарнымі праграмамі. Праект быў вусна падтрыманы, а далей справа не рушыла. Дый мы, відаць, перагарэлі. Праўда, была яшчэ спроба прапанаваць ідэю як канцэпцыю для вялікай выстаўкі,

> У беларускай фатаграфіі маецца адзін неаспрэчны козыр: яна — ёсць. Ды самае галоўнае — **у беларускай фатаграфіі няма музея.** А гэтая інстытуцыя, мяркую, вырашыла б калі не ўсе, дык вельмі многія пытанні нашай сферы.

што магла б рэпрэзентаваць мінулае Беларусі для гасцей Чэмпіянату свету па хакеі. Акрамя вуснай згоды таксама нічога здабыць не ўдалося.

Але праблема засталася, і чым далей, тым яна больш нарастае. У нас няма мецэнатаў, каб стварыць прыватны музей такога кшталту. А, з іншага боку, чаму ён мусіць стаць прыватным? Гэта ж якраз дзяржаўная справа! Хто яшчэ, калі не фатограф, аб'ектыўна захоўвае гісторыю дзяржавы для нашчадкаў, асвятляючы яе максімальна ўсебакова (апошняе асабліва заўважна цяпер)? Так, ёсць архівы, але яны — закрытыя інстытуцыі.

Да ўсяго, музей, апрача пастаяннай экспазіцыі, меў бы галерэю. Яна, лічу, магла б у значнай ступені аб'ектыўна фарміраваць грамадскую думку адносна сучаснай нам фатаграфіі. Выстаўляйцеся, хто хоча, экспануйце, што жадаеце ды дзе заўгодна, але тое, што будзе прадстаўлена ў Музеі фатаграфіі, — прайшло адсеў, вылучана групай прафесіяналаў розных поглядаў і пакаленняў, таму з іх выбарам давядзецца лічыцца.

Пакуль такога падыходу не займеем, на зрухі спадзявацца не варта. А гэта праблема. Менавіта праз адсутнасць пляцоўкі ў большасці нашых маладых фатографаў моцы хапае на тое, каб заявіць пра сябе. А што далей? Дзе яны? У якім "соку" "варацца"? Маецца і процілеглы аспект: любая размова па сучаснай беларускай фатаграфіі патрабуе яе гісторыі — гэткага ўсеабдымнага фаліянту. Яго ўкладанне якраз і магло б стаць адной са значных спраў будучага музея.

Папоўніць рэпертуар: ці ёсць перспектывы?

Ці хапае мне сёння рэпертуару як сольнаму артысту? У гэтым сэнсе мне пашанцавала: магу выконваць творы, што любяць слухачы ў маім выкананні з часоў "Песняроў", а цяпер і "Беларускіх песняроў". І хаця працую па-за гуртом не так шмат, бачу пэўныя праблемы калег-салістаў.

ТЭКСТ

Валерый ДАЙНЭКА,
заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, саліст ансамбля "Беларускія песняры"

Калі мне хочацца запісаць песні з сучасным гучаннем, я сутыкаюся з тым, што для многіх маладых, і не толькі, аўтараў праз свой узрост я — бесперспектыўны артыст. Скажам, мне даў паслухаць пару новых песень кампазітар і прадзюсар Максім Алейнікаў, яны мне спадабаліся, але ён сказаў, што яны не для майго веку. І такі выпадак не адзіны. Прызнацца, і з гэтай нагоды калі мяне запрашаюць запісаць што-небудзь сучаснае, я не адмаўляюся, хоць, бывае, і адчуваю досыць выразна: не маё… Унікнуўшы ў музыку, прасякнуўшыся тэкстам, пачынаеш разважаць: маўляў, чым нехта зробіць абы-як, лепш праспяваць, прынамсі, якасна самому. Гэтак сталася і з песняй да серыяла "Сляды апосталаў", якая атрымала пасля Нацыянальную музычную прэмію.

Другая праблема, думаю, таксама актуальная для нашых артыстаў. Я прашу кампазітара напісаць мне песню, тлумачу "тэхзаданне". "Не пытанне. Чатыры тысячы у.а.", — кажа ён мне. Я пачынаю думаць, ці плаціць такія грошы (няхай нават тры ці дзве тысячы тых самых у.а.) за песню, якая мне… амаль нічога не прынясе. Ну, запішу, аднясу на радыё. Пакруцяць яе там з тыдзень — і, згодна з канвеерным прынцыпам, яна знікне з ратацыі. Раскручваць далей — шукаць падыходы да тэлебачання (у тым ліку расійскага). І ці стане яна папулярная ў выніку? Усё гэта, прызнацца, стрымлівае мае парыванні ў папаўненні рэпертуару свежай рэччу. І, нешта падказвае, не толькі ў мяне такое стаўленне.

Паўсюль павінна быць моладзь. І гэта правільны падыход. А нам, на жаль, "дажываць" са сваім рэпертуарам. Вось, скажам, ад амерыканскага гурта "Chicago" ніхто ўжо даўно не чакае новых рэчаў. Думаецца, гэтак жа і ад артыстаў, што выйшлі з "Песняроў". Праўда, існуюць некаторыя магчымасці. На адным з юбілеяў Ігара Лучанка паспрабаваў выканаць ягоную "Алесю", што ў ансамблі ніколі не была ў маёй сталай праграме (хіба спяваў яе "на замене" ці ў фармаце папуры) поруч з "Зачараванай", паколькі іншых песень Ігара Міхайлавіча не выконваў. Тым не менш, песня знаёмая публіцы (і мне самому), таму атрымалася няблага.

> **Паўсюль павінна быць моладзь.** І гэта правільны падыход. А нам, на жаль, "дажываць" са сваім рэпертуарам. Вось, скажам, ад амерыканскага гурта "Chicago" ніхто ўжо даўно не чакае новых рэчаў. Думаецца, гэтак жа і ад артыстаў, што выйшлі з "Песняроў".

Што да сольных праектаў, то мне пашанцавала не толькі за кошт магчымасці выканання твораў з "песняроўскіх" часоў (уключаю ў выступленні парадку пяці нумароў такога кшталту, што праходзяць праз увесь канцэрт), але і ў сувязі з наяўнасцю шэрагу джазавых стандартаў ды рамансавых рэчаў (скажам, "Сто лет", "Я схожу по тебе с ума", "Обманите меня"). Апошнія заўжды праходзяць з поспехам сярод публікі з жанчын пасля сарака.

Ці маю я актыў аўтараў? У асноўным, са мной супрацоўнічае стары сябра Дзмітрый Далгалёў, з якім завяршаем працу над двайным альбомам: засталося запісаць пару твораў, якія далучацца і да вядомых песень (пачынаючы ад "Гаю мой, не кліч", "Погоди" пачатку 1990-х, што былі актуальнымі ў свой час і няблага гучаць сёння), і да зусім новых. Гэта будуць творы ў стылі менавіта Далгалёва, без прыцягнення старонніх аранжыроўшчыкаў. Запісваліся на студыі нашых знаёмцаў. Праўда, цяжка пакуль сказаць, ці станем мы займацца выпускам альбома і яго распаўсюджаннем самі альбо прыцягнем адзін з айчынных лэйблаў, які прыме на сябе выдаткі.

Дарэчы, працуем з Дзмітрыем над альбомам не першы год. Бо што такое песня? Яе можна запісаць з першага дубля, рабіць запіс гадзіну (а можна за яе ж і дзве-тры зафіксаваць, калі ты ў добрай форме, вывучыў мелодыю, нюансы, тэкст), дзень, месяц… Але толькі прыняўшы фінальны варыянт выканання, над ёй пачынаецца сапраўдная праца. А "рабіць" адну чатырохвілінку можна і паўгода.

Я згадаў тэкст песні. Заўжды кажу, што ён для мяне не на першым месцы. Ды бывае і так, што прыходзіш на студыю з яго дасканалым веданнем, але ён пачынае "рэзаць" сваёй штучнасцю, ненатуральнымі спалучэннямі слоў: фраза не спяваецца, не пасуе табе па сэнсе. А яшчэ існуюць выпадкі, калі з тэкстам ты сутыкаешся ўпершыню проста на студыі. Гэтыя праблемы, дарэчы, узнікаюць, калі альбом ці песня пішуцца з эканоміяй часу, фінансаў альбо яшчэ чагосьці. А эканомія амаль ніколі не вядзе да выніку, што задаволіць усе суб'екты творчага працэсу…

Прынцыпы аднаго кантэнту

Мы называем наш канал сацыякультурным. Ён адлюстроўвае самаідэнтычнасць нацыі, распавядае пра культуру Беларусі ва ўсіх яе праявах, распавядае пра дзень сённяшні і прапануе праграмы пра людзей ды падзеі, аб якіх дзесяцігоддзямі не гаварылася ў беларускім тэлеэфіры. Кажу як пра архіўныя перадачы, так і пра створаныя нядаўна. І такія праекты знаходзяць у тэлеспажыўца жывы водгук.

ТЭКСТ

Сяргей МАКАРЭЙ,
намеснік галоўнага дырэктара галоўнай дырэкцыі тэлеканала "Беларусь 3"

Пра тое сведчаць інтэрактыўныя апытанні, што праводзяцца ў рамках некаторых нашых перадач, а таксама звычайныя і электронныя лісты, якія прыходзяць ад гледачоў. Дзякуючы такому сталаму кантакту мы можам адмовіцца ад якіхсьці праграм альбо мадыфікаваць іх і, натуральна, фарміраваць новую праграму перадач, улічваючы пажаданні людзей.

Якраз распачаўся новы тэлесезон, у якім гледачоў канала чакае, як мы спадзяёмся, мноства прыемных сюрпрызаў. Так, стартавала жывая музычна-пазнавальная праграма пра бардаў "Подых струн". Пра гэтых творчых людзей наша ТБ ужо стала забываць. Але яшчэ летам пра іх мы знялі некалькі тэлеверсій канцэртаў з апошняга фэсту "Вялікая бард-рыбалка". З'явілася праграма пра паэзію, а таксама пра паэтычныя пародыі "Ды@блог "P.S.". Расшыфраваць "P.S." можна і як "Пастскрыптум", і як "Паэтычныя сустрэчы", і як "Паэты смяюцца".

> **Перапыняць рэкламай класічны фільм** — значыць парушаць яго мастацкую цэласнасць, груба ўмешвацца ў задуму творцы, у сам твор. Вядома, нехта можа ўсміхнуцца, але...

У праекце "Навукаманія" папулярнай мовай раскажам пра айчынную навуку, пра складаныя працэсы, якія адбываюцца ў ёй. Да 90-годдзя беларускага кіно запусцілі цыкл пад назвай "Старыя казкі", куды ўваходзіць уласна карціна — казка альбо кіно для дзяцей, знятае на "Беларусьфільме", — і дакументальная стужка пра тое, як яна стваралася. Аднавілі таксама здымкі праграмы "Святло далёкай зоркі", прысвечанай вядомым беларусам, якіх сёння ўжо з намі няма. Працягнем і рэтраспектыўныя паказы фільмаў выдатных кінарэжысёраў, дэманстрацыю карцін, прымеркаваных да нейкіх знакавых дат.

І мы пакуль не збіраемся адмаўляцца ад той нашай прынцыповай пазіцыі, пра якую ведаюць тэлегледачы канала: гэта адсутнасць блокавай рэкламы. Мы лічым, што, напрыклад, перапыняць рэкламай класічны фільм знакамітага рэжысёра — значыць парушаць яго мастацкую цэласнасць, груба ўмешвацца ў задуму творцы, у сам твор мастацтва. Вядома, нехта можа ўсміхнуцца, маўляў: уваходзячы ў холдынг Белтэлерадыёкампаніі, мы можам дазволіць сабе адмовіцца ад такога выгляду рэкламы. Дзякаваць богу, холдынг, а таксама, у рэшце рэшт, дзяржава могуць дазволіць сабе мець і ўтрымліваць такі канал, як наш, які прапагандуе асноватворныя для грамадства рэчы!..

Нам нярэдка задаюць пытанне пра тое, калі ж тэлеканал стане цалкам беларускамоўным. Мы ніколі не казалі, што плануем гэта зрабіць. Да ўсяго, рэаліі такія, што большая частка аўдыторыі аддае перавагу і рускамоўнаму тэлекантэнту. Але задачу павялічыць колькасць праграм, фільмаў на беларускай мове перад сабой ставім. Са стужкамі гэта ажыццявіць больш складана, паколькі, дапусцім, для перакладу замежных карцін патрабуюцца немалыя сродкі. А на кінастудыі "Беларусьфільм" мы часта не можам, на жаль, знайсці стужкі, першапачаткова знятыя на беларускай мове. Аднак з тых карцін, што маюць і рускамоўную, і беларускамоўную версіі, мы абавязкова паказваем беларускамоўную. І яшчэ адным пацвярджэннем нашых намаганняў па павелічэнні колькасці праграм на роднай мове ў новым сезоне можа стаць прэм'ера тэлевіктарыны "Размаўляем па-беларуску", дзе глядач мае магчымасць праверыць сваё веданне мовы.

Паверце, я быў бы шчаслівы, каб увесь наш кантэнт быў на беларускай мове, але сёння гэта немагчыма па вызначэнні. Іншае пытанне — ці быў бы шчаслівы той чалавек, які выбірае рускую мову як вядучую для сябе, калі б адзіны сацыякультурны тэлеканал у краіне гэтага выбару яго пазбавіў? Але і тое не галоўнае. Самае важнае, каб тэлеканал знаходзіў свайго гледача, каб колькасць нашых прыхільнікаў з кожным разам павялічвалася.

Прэм'ера новай мастацкай стужкі "Белыя росы. Вяртанне" адбудзецца сёння ў рамках фэсту **"Покліч Палесся"** ў аграгарадку "Ляскавічы".

Фанкавы калайдар у рэжыме "crescendo"

Каму аркестр — шоу?

Аляксандр ЛІПНІЦКІ ўвесну справіў 30-годдзе. Але, падлічыўшы зробленае за гэты час, разумееш, што юбілей мог бы пачынацца і з "пяцёркі". Мяркуйце самі: атрымаў вышэйшую адукацыю па некалькіх музычных спецыяльнасцях, паспеў папрацаваць у самых знаных навучальных установах і творчых калектывах краіны з эстрадна-джазавым ухілам. А галоўнае — яшчэ вучнем каледжа пачаў ствараць эстрадны аркестр, два гады таму пазначыўшы яго ўласным імем — "Lipnitsky Show Orchestra".

Надзея БУНЦЭВІЧ

Два гады таму гэты калектыў, яшчэ ў статусе вучэбнага "Simphonic Drive Orchestra" ў складзе Мінскага музычнага каледжа імя М.Глінкі, "засвяціўся" на падрыхтоўцы да "Еўрабачання": аркестравая аранжыроўка конкурснай песні гурта "Litesound", зробленая Аляксандрам Ліпніцкім, была бадай лепшай за аўтарскую. Стаўшы самастойным, шоу-аркестр Ліпніцкага ўдзельнічаў у абодвух міжнародных праектах сталічнага "вулічнага джаза" (летась — ля Ратушы, сёлета — ля Палаца спорту). Падтрыманы АНТ, з якім супрацоўнічаў і раней, калектыў правёў сумесны сольны вечар з сястрой Сашы — Б'янкай, зоркай расійскага R'n'B. На лістапад у Палацы Рэспублікі запланаваны юбілейны канцерт "Беларускіх песняроў" у суправаджэнні "Lipnitsky Show Orchestra". Усе аранжыроўкі для сумеснага выступлення Аляксандр піша сам. Неўзабаве павінен выйсці і аўтарскі альбом Ліпніцкага, складзены з яго ўласных вакальна-аркестравых кампазіцый на словы Віктара Рудэнкі.

— Вы навучаліся граць на розных інструментах — свядома ці выпадкова? Нават музычную школу заканчвалі двойчы: па класе трубы і, праз год, ужо як ударнік. Дый на фестывалях і конкурсах перамагалі па розных намінацыях…

— Раней мне здавалася, што трэба было адразу ісці на ўдарныя: гэта ж колькі часу я дарма змарнаваў, займаючыся на іншых інструментах! А цяпер разумею: для мяне як дырыжора і аранжыроўшчыка — гэта неацэнны вопыт. Чым больш інструментаў ведаеш, тым лепш. Ідэал — хаця б патроху асвоіць усе. Пачынаў я, дарэчы, як і большасць юных музыкантаў, з фартэпіяна. У музычную школу мяне адвялі бацькі, але інструмент я выбраў сам. Маці, праўда, хацела, каб я граў на саксафоне, але яго не было ў пракаце. І я спыніўся на піяніна: у гэтым вялізным "куфры" з клавішамі-прыступкамі была нейкая таямніца. А потым "захварэў" на барабаны. Спачатку стукаў-грукаў па ўсім, што знаходзіў на кухні: місках, каструльках, патэльні. Асабліва добра было выкарыстоўваць набор для спецый — гэта ж суцэльная ўдарная ўстаноўка!

— У сям'і не было музыкантаў?

— Хіба прадзед. Ён быў цымбальным майстрам, працаваў у знакамітым тэатры Уладзіслава Галубка.

— Дык вось адкуль вашы тэатралізаваныя праекты! І ў шоу на "Лініі Сталіна", і на джэм-сэйшне ў дзень трыццацігоддзя, дзе вы аб'явілі дрэс-код: гістарычныя, тэматычныя касцюмы…

— Сам я быў тады ў строі французскага салдата — таму, што ў школе вывучаў французскую мову. Тэатралізацыя, шоу, сінтэз мастацтваў і жанраў — покліч часу. Але, можа, і сапраўды нешта праз гены перадалося. Толькі далёка не адразу, бо ў дзяцінстве я быў сарамлівым.

— Сястра была байчэйшая? Можа, яшчэ і абараняла вас ад задзірыстых хлопцаў?

— Ды гэта я яе абараняў! Яна, канешне, заўсёды была, як кажуць, "прабіўной" — у добрым сэнсе слова. А я — можа, нават не столькі сарамлівым, колькі ціхім, задумлівым, летуценным, лунаў дзесьці ў сваіх фантазіях… Але, памятаю, ледзь хто яе зачэпіць — адразу ляцеў абараняць! Аднойчы нават, убачыўшы ў акно, не проста выбег, а літаральна "выкаціўся" з пад'езда: ратаваць яе ад аднакласнікаў!..

— А вось ад шоу-бізнесу вы яе "не ўратавалі". Дый самі трапілі ў яго пастку! І, падобна на тое, выратоўвацца не спяшаецеся. Ці ўсё ж ёсць настальгія па класіцы?

> У свой час я браў урокі кампазіцыі ў народнага артыста Беларусі, знанага Андрэя Мдзівані. Гэта дазваляе прафесійна ставіцца да працэсу сачынення, **ацэньваць сябе "збоку"**. Ды ўсё ж апошняе слова — за публікай.

Аляксандр Ліпніцкі. / Фота Юрыя ІВАНОВА

— Я не падзяляю музыку на класіку, фольк, джаз... Ёсць музыка — і гэтым усё сказана. Нізкаякасны ж гукавы "прадукт" музыкай не называю.

— А як прыйшлі да джаза? Прыклады ранняга далучэння музыкантаў да джаза пачалі з'яўляцца — у тых жа дзіцячых музычных школах. Калі вы вучыліся, такога не было?

— Афіцыйна — пэўна, не. Але ўсё залежыць ад выкладчыкаў! Ніхто не перашкаджае ім пашыраць праграму, знаёміць навучэнцаў з рознымі кірункамі, жанрамі, разнастайнымі адгалінаваннямі. Калі мне было прыблізна гадоў адзінаццаць і я вучыўся граць на трубе, мой настаўнік даў мне касету з запісамі Луі Армстранга. З таго ўсё і пачалося! Я вучыўся збольшага праз запісы — іх слуханне і, пазней, аналізаванне. Таму крыху зайздрошчу тым, хто вучыцца цяпер: у Інтэрнэце можна знайсці, бадай, усё, што пажадаеш. Была б толькі цікавасць! Дый само навучанне джазу сёння куды лепшае, чым дзесяцігоддзе таму...

— Вы ж да гэтага таксама руку прыклалі! Выкладалі ў абедзвюх навучальных установах, якія скончылі — Каледжы імя Глінкі і БДУКіМ, — выступілі ініцыятарам стварэння вучэбнай праграмы па вывучэнні джазавых стандартаў…

— Таму што разумею, наколькі ў джазе важная грунтоўная базавая адукацыя — такая ж, якая існуе ў акадэмічнай музыцы. Я ж у музычнае вучылішча паступаў на аддзяленне духавых і ўдарных інструментаў, а на эстраднае перавёўся з другога курса, калі канчаткова вызначыўся, што мне трэба.

— Канчаткова? Скончылі каледж як ударнік. Ва Універсітэт культуры і мастацтваў паступілі як эстрадны трубач, да Уладзіміра Семенюка…

— І паралельна займаўся ў Вячаслава Бартноўскага — па класе дырыжыравання эстрадна-сімфанічным аркестрам. Потым стажыраваўся. У Маскве і ў нашага Пятра Вандзілоўскага. Бо мне патрэбен — аркестр! Я і ў музычны каледж вярнуўся, ужо ў якасці выкладчыка, з адной матывацыяй: каб была магчымасць рабіць уласныя праекты.

— Але гэта не перашкодзіла вам больш чым дзесяцігоддзе "адбарабаніць" у розных калектывах. Ды яшчэ якіх! Спачатку, калі не памыляюся, быў аркестр цырка. Потым — Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр на чале з народным артыстам краіны, прафесарам Міхаілам Фінбергам. А яшчэ гурты "Attava", "Лепрыконсы"… Калі вы марылі пра ўласныя праекты, навошта было, як вы сказалі ў пачатку размовы, "час марнаваць" на чужыя?

— Каб спазнаць знутры, на ўласнай практыцы, што такое аркестравы і ансамблевы калектывы, што патрабуецца для іх паўнавартаснага жыцця, развіцця.

— Дык што ўсё ж трэба?

— Унутраная касмічная энергія.

— Увага, чытачы! Зараз наш госць Аляксандр Ліпніцкі падзеліцца досведам, як паводле фэншуй расставіць... музыкантаў у аркестры. А дырыжора — тварам на ўсход?

— Дарма смяецеся! Бо перад тым жа Міхаілам Фінбергам можна зняць капялюш: настолькі зладжана, без аніякіх збояў, працуе і ягоны калектыў цалкам, і кожны асобны ў ім музыкант ды супрацоўнік. Кіраўнік запускае механізм — і той працуе. Безадмоўна, бездакорна! Але ж трэба было і "механізм" той скласці, і "ключыкі" да яго падабраць…

— Карацей, ніякай імправізацыі — толькі добра адладжаная мехінка, якая працуе як гадзіннік. А што тады джаз, як не імправізацыя? Ці лепшая імправізацыя — тая, якая лепш падрыхтавана?

— Вы мяне спецыяльна правакуеце? Джаз — гэта не проста імправізацыя, хаця элементы спантаннасці ў ім вельмі важныя. Я сказаў бы так: джаз — гэта імгненны, у дадзеную хвіліну, настрой. Гэта "тут і зараз", перададзеныя музыкай. А для гэтага важны дух кожнага музыканта.

— Між іншым, цудоўнае азначэнне! Яно, да ўсяго, ахоплівае любую стылявую палітру і самыя неверагодныя разнавіднасці джаза. Але ж адметнасць "Lipnitsky show orchestra" пакуль не столькі стылявая, колькі, найперш, візуальная. Ваш калектыў называюць "танцуючым" аркестрам: вы рухаецеся, прытанцоўваеце, нават бег на месцы імітуеце...

— Так, мы граем поп, фанк, лацін, неасоўл. Працуем з харэографам, прапаноўваючы свае пластычныя ідэі. Займаемся ў харэаграфічнай зале — усё дзеля таго, каб стварыць якаснае, відовішчнае шоу. Але ўсё больш з'яўляецца і аўтарскіх кампазіцый. У свой час я браў урокі кампазіцыі ў народнага артыста Беларусі, знанага Андрэя Мдзівані. Гэта дазваляе прафесійна ставіцца да працэсу сачынення, ацэньваць сябе "збоку". Ды ўсё ж апошняе слова — за публікай. Фармат аркестра і наш рэпертуар падбабяюцца слухачам, прычым самага рознага ўзроўню. Бо мы выступаем не толькі ўласна на канцэртных сцэнах, але і на карпаратывах, якія "кормяць" цяпер усіх, хто працуе на эстрадзе. Райдар у нас вельмі просты: каб была добрая апаратура і пляцоўка нармальных памераў. У аркестры — васямнаццаць чалавек, і трэба не пазбіваць адно аднаго лакцямі. Асабліва калі напрыканцы выступлення, паводле традыцыі, раскручваем фанкавы калайдар…

— Наколькі дастасавальна выкарыстанне ў музыцы гэтага фізічнага тэрміна, якім пазначаюць паскаральнік элементарных часціц? Ці гэта проста частка піяру? Вы ж самі ведзяце канцэрты — значыць, можаце наўпрост, "без пасрэднікаў", маніпуляваць увагай і дзеяннямі публікі…

— А чаму б і не? Ужываецца ж у мастацтве паняцце энергіі — таксама, здавалася б, фізіка. Першы імпульс, першая хваля энергіі, руху, таго ж бегу зыходзяць ад артыстаў, але далей усё гэта павінны падхапіць гледачы. Калі так адбываецца, дык сутыкаюцца два наймагутнейшыя энергетычныя патокі. Раней усе гаварылі пра вялікі адронны калайдар, пабудаваны ў Швейцарыі. Але будучыня, я веру, — за фанкавым, бо ад яго стане весялей на планеце Зямля. Калі ж хочаце музычных тэрмінаў, дык магу сказаць, што апошні год праходзіў для мяне ў рэжыме "crescendo" — узмацнення дынамікі.

— І да кульмінацыі, будзем спадзявацца, яшчэ далёка. Поспехаў вам!

К

ф о т а ф а к т



"...Вера" развіталася

На мінулым тыдні завяршыліся здымкі стужкі рэжысёра Аляксандры Бутар "Салодкае развітанне Веры". У гэты дзень на пляцоўцы ля Дома-музея Ваньковічаў у цэнтры сталіцы сустрэліся выканаўцы галоўных роляў у карціне (справа налева) народны артыст Літвы Юозас Будрайціс, акцёры Нэлі Савічэнка-Кліменэ і Павел Харланчук. / **Фота Аляксандра ДЗМІТРЫЕВА**

Беларускі дзяржаўны маладзёжны тэатр распачне 30-ы, юбілейны сезон прэм'ерай спектакля **"Саня, Ваня, з імі Рымас"**.

Сабраўся быў напісаць пра росквіт нацыянальнай культуры, пра паспяховае замацаванне і вучобу маладых спецыялістаў на сяле. Былі ж тыя часіны за савецкім часам, былі. У Глыбокім, да прыкладу, дзе ў мясцовым аддзеле культуры ўзніклі першыя (не толькі на Віцебшчыне, але і ў краіне) Дом рамёстваў ды гаспадарчая група, праблем з жытлом для кадраў не існавала. Моладзі прадастаўляліся не пакоі ў інтэрнаце, а кватэры ў трохпавярховым доме, узведзеным сіламі аддзела. І ён, натуральна, не ведаў, што такое вакансіі. І менавіта ў Глыбокім узнік тады Клуб маладых спецыялістаў. Структура не была фармальнай, а прызначалася для хутчэйшай адаптацыі толькі што "спечаных" у ВНУ і ССНУ кадраў да мясцовых эканамічна-творчых рэалій...

Дык што змянілася з той пары? Заробак у клубнікаў, бібліятэкараў ды музейшчыкаў не вырас. А вось інтэрнацкі пакой для "культурных" маладзёнаў застаўся гарантаваным далёка не ў кожным раёне. Нейкая незразумелая жыццёвая нестыкоўка атрымліваецца: роля рэгіянальнай культуры ў справе барацьбы з усё больш ваяўнічай бездухоўнасцю неймаверна вырасла, а прэстыж прафесіі носьбіта нацыянальных традыцый амаль адсутнічае.

Яўген РАГІН

"Чыстыя" з-пад "нажніц"

І саснілася мне **вакансія**… Ды хто яе выбера?

Скажы мне, сайт...

Вось з такім, не вельмі сонечным, настроем адкрыў у панядзелак 8 верасня сайт Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь. Той яго раздзел, дзе чатыры старонкі распавядаюць пра наяўнасць вакансій у сферы культуры (раздзел называецца, праўда, "Дзеячы літаратуры і мастацтва") і ў большай ступені — раённай ды сельскай. Сайт уразіў… Не, не велічынёй заробкаў, а ёмістасцю прапаноў на любы густ.

Паспрабую аб'яднаць іх у тэматычныя групы. На якія прафесіі ў нас асаблівы дэфіцыт? А нічога не змянілася за апошнія гады: на хормайстраў (9 вакансій) і харэографаў (6). Зэльвенскі аддзел мае патрэбу ў чатырох хормайстрах з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй: для Каралінскага, Галынкаўскага, Дабраселецкага і Міжэрыцкага СДК. Заробак — 2 291 329 рублёў. Гэткіх жа спецыялістаў не стае ў аддзелах Ельскага, Бераставіцкага, Слонімскага райвыканкамаў. Але заробкі тут чамусьці меншыя: 1 700 000, 1 784 300 і 1 983 000 рублёў адпаведна. Вось такая "разбежка" ў заробках і прымусіла скіраваць гэты артыкул у рэчышча больш эканамічнае, чым ідэалістычна-апавядальнае. Так што даруйце за такое багацце дакладных лічбаў. Пры мізэрных заробках кожную капейчыну ўлічваць даводзіцца.

У кожным раёне — свае заробкі?

Гэткае ж разыходжанне ў сумах заробкаў назіраецца і па графе "харэографы". Адукацыя — сярэднеспецыяльная. А вось якія заробкі прапаноўваюць аддзел Лагойскага райвыканкама — 2 100 000 рублёў, РДК Вялікай Бераставіцы — 2 103 700, ГЦКД Воранава "заманьвае" балетмайстра на 1 995 670 рублёў, аддзел Краснапольскага райвыканкама прагне атрымаць харэографа за 1 860 000 рублёў, а Бабруйскага райвыканама — асістэнта балетмайстра на 0,5 стаўкі — за 1 760 000 рублёў. Чашніцкі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці хоча займець балетмайстра ўсяго за 1 мільён рублёў у месяц, праўда, таксама на палову стаўкі... Словам, з нярадасных лічбаў заробку трэба выбраць самыя лепшыя. Не дзіва, што вакансіі набываюць характар хранічнай хваробы.

Затое не думаю, што доўга застануцца без асістэнта дырыжора ў Палацы Рэспублікі: 5 600 000 рублёў. Ці без артыста-вакаліста ў Вялікім тэатры Беларусі: 3 610 365 рублёў. Але гэта, так бы мовіць, эпізадычнае сталічнае выключэнне на фоне не надта радаснай кадравай стабільнасці ў рэгіёнах.

Працягнем. Вышэйназваны прыклад з неблагімі заробкамі можа выклікаць заканамерны аргумент: мінскія вакансіі будуць запаўняцца спецыялістамі з вышэйшай адукацыяй, якая па вызначэнні "каштуе" даражэй за сярэднюю спецыяльную. Ні ў якім разе. Любы спрактыкаваны гарадскі ці раённы работнік аддзела кадраў на такі аргумент рассмяецца вам у твар. Гомельскаму каледжу мастацтваў імя Н.Ф. Сакалоўскага як паветра не хапае канцэртмайстра, ды яшчэ і са стажам дзейнасці ў ВНУ. Дык вось такому спецыялісту з вышэйшай адукацыяй за работу ў дзве змены цягам месяца прапануюць 1 756 730 рублёў. Як не зарабіць і больш чым 1 756 730 рублёў у месяц канцэртмайстру Асіповіцкай ЦКС ці канцэртмайстру Жлобінскай ДШМ № 2, якому "свеціць" сума ў 1 760 000 рублёў.

Зэльвенскі аддзел мае патрэбу ў чатырох хормайстрах з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Заробак — 2 291 329 рублёў. Гэткіх жа спецыялістаў не стае ў Баранавічах, Ельску, Бераставіцы, Слоніме. **Але заробкі тут меншыя:** 1 115 000, 1 700 000, 1 784 300 і 1 983 000 рублёў адпаведна. Вось такая "разбежка" і прымусіла скіраваць гэты артыкул у рэчышча эканамічнае...

Эканоміка — справа таямнічая

Больш шанцуе мастакам. На Брагіншчыне работніку з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй збіраюцца плаціць 2 423 000 рублёў, а ў бібліятэцы Новай Мышы (Баранавіччына) абяцаюць 2 430 000 рублёў. У Жыліцкага гістарычнага комплексу-музея (Кіраўшчына) крыху большыя амбіцыі. Тут чакаюць мастака з вышэйшай адукацыяй. Але яго месячны заробак чамусьці ніжэйшы за заробак гіпатэтычна патэнцыйнага калегі з Брагіна ці Новай Мышы і складзе толькі 2 148 555 рублёў… Растапчы мяне камар, але я нічога не разумею ў гэтай эканоміцы.

Вось, скажам, рэжысёры. Прафесія больш чым элітная. Але па месячнай заработнай плаце гэтага не скажаш. Патрэбны яны ў Зэльве, Ашмянах, Наваполацку (сумяшчальнік), Буда-Кашалёве, Ваўкавыску і на Баранавіччыне. І месячныя заробкі ў іх будуць вагацца ад 1 780 000 (Ваўкавыск, дзе чакаюць спецыяліста з вышэйшай адукацыяй) і 1 864 900 рублёў (Ашмяны, спецыяліст — з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй) да 2 023 583 рублёў у Зэльве, дзе таксама задаволяцца спецыялістам, які скончыў ССНУ…

У Гомельскім політэхнічным тэхнікуме я вывучаў эканоміку лесанарыхтовак. Настаўнік, чалавек дасведчаны і надзвычай разумны, паставіў мне залік, заплюшчыўшы вочы. І сказаў на развітанне: "Усё роўна, Рагін, эканоміка рана ці позна прыйдзе да цябе і возьме за горла!" Прыйшла і ўзяла. Днямі мне саснілася вакансія — лядашчая істота, збузаваная жыццём, з працягнутай рукой…

Заканчэнне артыкула пра вакансіі ў культурнай сферы чытайце **на старонцы 12.**

Практычны расклад

Скалькуляваць ініцыятыву

Сённяшні суразмоўца "К" — эканаміст аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Бярозаўскага райвыканкама Святлана КЛЕБАНОВІЧ. Гэтым разам рэдакцыю зацікавіў і ход аказання платных паслуг, і разнастайнасць іх відаў. Вядома, што кошт культурнага прадукту наўпрост залежыць ад яго якасці, а бясплатнай паслуга (апрача сацыяльна значных акцый) стане ў нашай сферы толькі тады, калі на крамных паліцах з'явіцца бясплатная кілбаса. Гаворка са спецыялістам — не толькі пра гэта: рэдакцыю зацікавіла анатомія, так бы мовіць, культурнай паслугі, калькуляцыяй якой пастаянна займаецца эканамічная служба аддзела.

Яўген РАГІН

— Як часта даводзіцца займацца складаннем такіх калькуляцый?

— Штодня рыхтую дзве-тры. Гэта ў сярэднім. Іншым разам і больш бывае.

— А хто тут, цікава, лідзіруе: клубнікі ці бібліятэкары?

— Работнікі клубаў.

— Няўжо і прэцэдэнтаў не было, каб бібліятэкары ў незвычайнасці паслуг клубнікаў абагналі б?

— Справа ў тым, што бібліятэкі даўно і адначасова распрацавалі калькуляцыі на свае пастаянныя паслугі. Яны проста зацвярджаюцца пры ўмове, што цана не змяняецца.

— Дык што, паслугі ў бібліятэк — толькі стандартныя?

— Натуральна, не. Скажам, калькуляцыя, да прыкладу, на бібліятэчны лялечны спектакль складаецца, а потым дзейнічае як пастаянная… Але з клубнікамі тут канкурыраваць цяжка. Не падумайце толькі, што мерапрыемствы нашых бібліятэк нецікавыя. Кожнае — адмысловае.

— Ведаю пра гэта цудоўна... Атрымліваецца, што тыя штодзённыя прапановы з месцаў на складанне калькуляцый — заўжды арыгінальныя?

— Менавіта так. Я працую ўжо больш за дзесяць гадоў, заспела станаўленне гэтых паслуг. Сённяшні стан спраў такі: кожны з СК ці СДК імкнецца ўдасканаліць сваю дзейнасць, насыціць яе сучасным зместам. Танцавальны вечар дзесяцігадовай даўніны нельга параўнаць з сённяшняй тэматычнай дыскатэкай.

— А вы адсочваеце сітуацыю з клубнай актыўнасцю, калі тая або іншая ўстанова не надта турбуе вас з прапановамі на складанне калькуляцый?

— Безумоўна! Штоквартальна праводзім нарады (апошняя была ў ліпені), аналізуем сітуацыю, падштурхоўваем адстаючых. Карацей, выносім сітуацыю на агульнае абмеркаванне. Апошнім разам дзяліліся досведам клубнікі са Светачы і Здзітава. Гаворка ішла пра тое, каб уцягваць у справу самыя розныя слаі насельніцтва.

— Назавіце, калі ласка, яшчэ актывістаў.

— Шмат прапаноў паступае са Спорава. Мясцовыя клубнікі нядаўна, у жніўні, ладзілі карпаратыўныя мерапрыемствы па святкаванні юбілеяў сваіх сельгаспрадпрыемстваў.

— І ўсё ж: наколькі разнастайныя віды паслуг?

— Я ўжо казала пра новы змест старых мерапрыемстваў. Цяпер шоу-праграма мае некалькі разнавіднасцей. Тое ж датычыцца і дыскатэк, канцэртаў, танцавальных вечароў, тэатралізацый, віншаванняў, карпаратываў, гурткоў і курсаў. Інакш кажучы, сэнарый, рэжысура, пастаноўка любой акцыі пастаянна ўдасканальваюцца. І гэта — натуральны працэс. Адстаць ад павеваў часу — значыць і якасць знізіць, і грошы, урэшце, згубіць.

— Гурткі ў вас таксама платныя?

Святлана КЛЕБАНОВІЧ, эканаміст аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Бярозаўскага райвыканкама

Калі трэба кампенсаваць расходы да правядзення мерапрыемства, аддзел авансам пералічвае ўстанове патрэбную суму, **але не больш за пяцьдзясят працэнтаў ад чаканай сумы выручкі**.

— У сельскіх клубах радзей, а ў гарадскіх — так. Гурткі ж такія: аэробіка, бокс, курсы ігры на гітары…

— Які самы прыбытковы від паслуг?

— Канцэрты. На сяле білет каштуе 10 тысяч, у райцэнтры — 15-20 тысяч рублёў у залежнасці ад маштабнасці мерапрыемства.

— Затратная частка калькуляцыі — абмежаваная?

— Да мяне звяртаюцца па распрацоўку калькуляцыі на асобную паслугу. Пералічваюць затраты, да прыкладу, на набыццё нейкіх расходных матэрыялаў. Паказваюць каштарысы і рахункі на затраты. Я вылічваю канчатковую агульную суму акцыі і цану білета. Калі трэба кампенсаваць расходы да правядзення мерапрыемства, аддзел авансам пералічвае ўстанове патрэбную суму, але не больш за пяцьдзясят працэнтаў ад чаканай сумы выручкі. Сюды, зразумела, уваходзяць прыбытак, падаткі, камунальныя затраты, налічэнні на заробкі... Таму натуральна, што затратная частка — абмежаваная.

— Як гадавы план па платных паслугах выконваеце?

— За восем месяцаў справіліся з ім на 115,1 працэнта.

К

Тыдні Германіі ў Беларусі распачнуцца 15 верасня выстаўкай "Казачныя сусветы" і працягнуцца да 10 кастрычніка.

Унікальная выстаўка **"Забытая вайна"**, прысвечаная 100-годдзю пачатку Першай сусветнай вайны, адкрылася на гэтым тыдні ў Гродне.

Мвстыхін

Мой журналісцкі досвед дае мне пэўныя падставы сцвярджаць, што культурныя імпрэзы, якія ладзяцца ў рэгіёнах, часта адрозніваюцца ад сталічных хіба што маштабам, але не якасцю. Да прыкладу, магу нагадаць мастацкую выстаўку ў Магілёве, якая была прымеркавана да Дня горада і 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Яна глядзелася б у мінскім Палацы мастацтва, і за мяжу яе везці было б не сорамна. Пра тую выстаўку мне ўжо даводзілася пісаць, але на мінулым тыдні я зноў быў у сталіцы Прыдняпроўя і наведаў Гарадскую выставачную залу. Выстаўка яшчэ працавала, але ў ёй адбыліся змены.

У Магілёве абмяркоўвалі **прысутнасць мастака ў соцыуме горада**

Хто за грошы, хто — за "дзякуй"?

Леніна Сівакова. "Гаспадар возера".

Аляксандр Сувораў. "Постаць у чырвоным".

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ
Мінск — Магілёў — Мінск

У час “круглага стала” прагучала думка, што Магілёў, горад з моцным эканамічным і культурным патэнцыялам, перспектыўны турцэнтр, **мае патрэбу ў шматфункцыянальным комплексе культурнага прызначэння**, які быў бы і музеем, і выставачнай прасторай, і сцэнічнай пляцоўкай. І працаваць над гэтай ідэяй трэба ўжо сёння.

Змены

Творы, што ў дадзеным кантэксце ўвасаблялі культурную гісторыю краю — Вітольда Бялыніцкага-Бірулі, Паўла Масленнікава, Марка Шагала, — адсутнічалі, а іх месцы на сценах занялі карціны мастакоў, якія жывуць і працуюць на Магілёўшчыне сёння.

Рыгор Шараеў. Бра (вітраж).

Не так выразна была выяўлена ваенная тэматыка, якая ў першай версіі экспазіцыі займала ганаровае месца. Я пацікавіўся ў гаспадароў аб прычыне метамарфоз, і мне патлумачылі, што зыходна экспазіцыя ствралася так, каб канцэптуальна пасаваць святу горада і галоўнаму святу дзяржавы. Цяпер жа “гістарычная частка” выстаўкі вярнулася на “месца пастаяннай прапіскі” — у музейныя зборы, а новая версія экспазіцыі трактуецца як справаздача Магілёўскай арганізацыі Беларускага саюза мастакоў да 40-годдзя ўтварэння ў вобласці філіяла творчага саюза і як дэманстрацыя творчага патэнцыялу мастакоў Магілёўшчыны. Маючае ж адбыцца абмеркаванне выстаўкі ў фармаце “круглага стала” з удзелам мастакоў, прадстаўнікоў органаў улады, журналістаў, музейшчыкаў і ўвогуле людзей, неабыякавых да стану культуры ў горадзе ды рэгіёне, дазволіць у пэўным сэнсе вызначыцца адносна культурных перспектыў ды іх матэрыяльнай асновы.

Рэтраспекцыя

Яшчэ да пачатку “круглага стала” мне давялося пагутарыць з Галінай Конанавай, якая ўзначальвала Магілёўскую арганізацыю Беларускага саюза мастакоў у 1992 — 1994 ды ў 2003 — 2007 гадах і без чыннага ўдзелу якой і сёння ў горадзе не адбываецца ніводная мастацкая акцыя. Як зазначыла яна, хоць юрыдычна філіял творчага саюза быў створаны ў рэгіёне ў 1974 годзе, фактычна арганізацыя існуе з 1946-га. Як і паўсюль у Беларусі, напачатку яна складалася з тых, хто прайшоў праз вайну і для каго вайна стала стрыжнявой тэмай творчасці. Іх мастацтва вызначалася высокай ступенню шчырасці і акрэсленасцю грамадзянскай пазіцыі. У пазнейшыя гады ў мастацтве рэгіёна так ці інакш адлюстроўваліся тэндэнцыі, увогуле ўласцівыя культурнаму працэсу ў Беларусі. У Магілёве распачыналі творчы шлях мастакі, якія потым зрабілі сталічную кар’еру. Але бывала і наадварот, калі творцы з мінскімі каранямі знайшлі сябе, свой почырк і тэму ў Магілёве. Рэгіён славуты сваімі мастацкімі пленэрамі, вядомымі ў бліжнім і далёкім замежжы. І ў тым, што Магілёў абіраўся Культурнай сталіцай Беларусі ды Садружнасці, ёсць немалая заслуга і мясцовых мастакоў. Карацей кажучы, было нямала таго, што варта згадваць з гордасцю. Аднак і праблем не абмінеш…

Спадарыня Конанава ўзгадвае, што ўжо ў сярэдзіне 80-х, калі яна прыехала працаваць у Магілёў, склалася сітуацыя, калі прафесійныя мастакі, якія звыкліся з тым, што дзяржава іх неяк падтрымлівае, забяспечвае працай, гарантуе сякі-такі заробак, адчулі сябе незапатрабаванымі. Горад, так бы мовіць, — сам па сабе, а мастакі — асобна. А калі яшчэ абласная арганізацыя страціла вытворчую базу — мастацкі камбінат, творцы пачалі разбягацца хто куды. Яшчэ добра, калі ў кагосьці атрымлівалася ўладкавацца блізка да мастацтва, пры справе, сумежнай са сваёй спецыялізацыяй. А камусьці давялося ўвогуле сысці ў сферы, вельмі далёкія і ад мастацтва, і ад культуры наогул. А што зробіш? Трэба жыць, сям’ю карміць… Так што мастацкая актыўнасць у горадзе і рэгіёне знізілася, але не спынілася. Трэба адзначыць, што Магілёўская арганізацыя — найменшая ў Беларусі. Калісьці яе членаў было 28. Цяпер іх колькасць вагаецца ў межах 22 — 25.

Матэрыяльная база арганізацыі, паводле слоў спадарыні Конанавай, трымалася на трох чынніках: камбінат, салон, выставачная зала. На сённяшні момант Магілёўскі філіял Беларускага саюза мастакоў з’яўляецца банкротам, не мае свайго рахунку, і вымушаны ладзіць тыя ж мастацкія выстаўкі не на сваёй, а на чужых пляцоўках. Гэта, зразумела, не трагедыя, але не надта зручна. Скажам, дамаўляюцца мастакі з Музеем імя Масленікава аб правядзенні ў ягоных залах выстаўкі. Установа можа пайсці насустрач, а можа і не, калі ў Музея свае планы, свая праграма, а Саюз да іх дачынення не мае.

Тэндэнцыі

Калі ў Выставачнай зале распачаўся рамонт, творцы не верылі, што пасля яго заканчэння памяшканне аддадуць пад мастацкія выстаўкі: самы цэнтр горада — надта ж зручная кропка для разгортвання камерцыйных праектаў. “Цяпер кажуць інакш: “Мы марым, каб гэтая зала стала для нас тым, чым была адпачатку: цэнтрам мастацкага жыцця Магілёва”. І, мяркуючы па першым здзейсненым у рэканструяваным памяшканні праекце, гэта магчыма”, — кажа на заканчэнне размовы Галіна Конанава.

“Круглы стол” прайшоў у выставачнай зале на фоне твораў экспазіцыі. Скажу шчыра, цэласнай, канцэптуальна акрэсленай гутаркі не атрымалася. Гэта звычайная справа. Са свайго досведу ведаю: як ні акрэслівай тэму сумоўя, усё адно кожны будзе гаварыць пра тое, што хвалюе асабіста яго. Скажам, мастакоў старэйшага пакалення непакоіць заняпад у нашым мастацтве сацыяльна значных тэм. У прыватнасці, тэмы народнага Подзвігу ў Вялікай Айчыннай вайне, якая ў Савецкай Беларусі мела статус нацыянальнай. Падобна на тое, кажуць творцы, што і прафесійнае майстэрства ўжо не ў пашане… Скульптура ператвараецца ў абстрактную “пластыку”, а жывапіс — у “дызайн на палатне”.

Змена эстэтычных ды ідэалагічных арыенціраў у любым грамадстве часам кардынальна змяняе стаўленне да творцаў, якія сумленна шчыравалі на ніве сацрэалізму. Разам з тым, удзельнікамі “круглага стала” выказвалася думка, што імкненне захаваць пераемнасць станоўчых традыцый у нашай культуры, у грамадстве — справа ўхвальная, але нельга не адзначыць пэўную неакрэсленасць са статусам маштабных праектаў грамадскага гучання.

Магілёўскія творцы гаварылі пра тое, што іхняя прысутнасць на мастацкіх пленэрах, якія ладзяцца на Магілёўскай зямлі, магла б быць больш прадстаўнічай, больш важкай, чым дзве-тры асобы. Таксама як і тое, што здараюцца сітуацыі, калі магіляўчане, у адрозненне ад мінчан ды экспертаў з іншых краін, працуюць у складзе журы на фэстах кшталту “Анімаёўкі” не за грошы, а “за дзякуй”.

Уладзімір Конанаў. Без назвы.

Перспектывы

Мастакі ды іншыя неабыякавыя да мастацтва людзі казалі пра недастатковa эфектыўную прапаганду мастацтва ўвогуле і рэкламу канкрэтных творчых акцый у прыватнасці. Вось і гэтая выстаўка магла б сабраць, як мяркуецца, больш гледачоў, каб яе больш актыўна рэкламавалі ў друку, на тэлебачанні, урэшце, на вуліцах горада. Дырэктар Музея гісторыі горада Магілёва Аляксей Бацюкоў (адрамантаваная выставачная зала ўваходзіць у структуру згаданага музея) у сувязі з гэтым заўважыў, што існуе закон, які вызначае, колькі грошай, які працэнт ад прыбытку дзяржаўная ўстанова можа выдаткаваць на рэкламныя мэты. Між тым, прыбытак ад мастацкіх выставак — невялікі… Зрэшты, праблема вырашальная: трэба альбо дамагацца змяненняў у закон, альбо шукаць іншыя сродкі фінансавання культурных акцый. І тое, і другое — магчымае.

Прадстаўнік Магілёўскага гарадскога ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі запэўніла прысутных, што ўлады гатовы ісці на кантакт з творчым саюзам, а старшыня Магілёўскай арганізацыі БСМ Андрэй Вераб'ёў у гэтай сувязі паведаміў, што абласная ўлада мае намер дапамагчы мясцовым мастакам ладзіць перасоўныя выстаўкі ў раёнах вобласці.

Паўстала і пытанне функцыянальнага выкарыстання памяшкання выставачнай залы. Сышліся на тым, што праводзіць у ім выключна мастацкія выстаўкі ды ладзіць выключна культурныя акцыі было б вельмі добра, але эканамічна немэтазгодна. Нават мінскі Палац мастацтва такой раскошы сабе дазволіць не можа. Значыць, будуць тут і кірмашы, і мэтавыя экспазіцыі немастацкага зместу, і семінары з канферэнцыямі.

А яшчэ ў час “круглага стала” прагучала думка, што Магілёў, горад з моцным эканамічным і культурным патэнцыялам, перспектыўны турыстычны цэнтр, мае патрэбу ў вялікім шматфункцыянальным комплексе культурнага прызначэння, які быў бы і музеем, і выставачнай прасторай, і сцэнічнай пляцоўкай. І працаваць над гэтай ідэяй трэба ўжо сёння. К

Днямі ў сталічным Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва адкрылася выстаўка твораў вядомага жывапісца, народнага мастака Беларусі Уладзіміра Тоўсціка, прымеркаваная, сярод іншага, і да Дня горада ў сталіцы. Сёлета мэтру споўнілася 65 гадоў, хоць гледзячы на яго і не скажаш, што ён ужо дасягнуў такога ўзросту. Дый творчасць ягоная — праўдзівы адбітак маладой душы, прагнай да жыцця, да вандровак і адкрыццяў. Мне чамусьці падумалася, што гэтая адносна невялікая экспазіцыя (залам згаданага музея пасуюць выстаўкі камернага фармату ды зместу) задумвалася Уладзімірам Антонавічам як канцэптуальная распрацоўка, як эскіз таго вялікага паказу, які ён зладзіць праз пяць гадоў у Нацыянальным мастацкім музеі.

Уладзімір Тоўсцік. "Мінск, год 2012. Свята горада".

Рэжысура Тоўсціка

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

У экспазіцыі прадстаўлены работы апошніх пяці гадоў. Самому мастаку, паводле ягоных слоў, гэтая выстаўка падаецца больш цэласнай і канцэптуальна выверанай, чым тая, што ён ладзіў на сваё 60-годдзе. Яно, бадай, і сапраўды так. Справа ў тым, што сэнсавым стрыжнем той вялікай экспазіцыі былі разнапланавыя, створаныя ў розныя перыяды творчасці на падставе розных жа эстэтычных уяўленняў палотны, якія прынеслі іх аўтару славу і статус сучаснага класіка. Гэта было ў нейкім сэнсе падсумаванне, спроба азірнуцца назад, перш чым вызначыць, куды крочыць далей. Зараз жа на суд публікі прадстаўлены творы, аб’яднаныя адной тэмай — “Горад” — і адзінай рэжысурай. Уладзімір Тоўсцік — прафесіянал, якому падуладныя форма ды колер і які сёння імкнецца асэнсаваць ды выявіць на палатне такую няўлоўную субстанцыю, як святло. Гаворка ідзе пра пошук новай гармоніі, калі жывапіснасць у кантэксце палатна паўстае не як функцыянальны чыннік, але сэнсавы стрыжань. Для мастака гэта азначае "карэкціроўку" “літаратурных”, апавядальных кодаў у бок падсвядомасці ды асацыятыўнасці. Інакш кажучы, творца, не аддзяляючы сябе ад соцыуму, імкнецца рэалізаваць уласную, ад Бога дадзеную, існасць. "Святло" і "свет" у гэтым кантэксце — сінонімы.

Хтосьці ж пабачыць у новых работах Тоўсціка нешта іншае.

Тэма выстаўкі — “Горад” — вельмі пасуе Дню горада. І горад Тоўсціка — гэта не будынкі ды вуліцы, а метафізічная прастора, у якой праходзіць чалавечае жыццё. Ягоны Горад — горад увогуле. Гэта адначасова Мінск, Рым, Масква, Вільнюс… У ім увасоблены ўсе гарады, у якіх бываў мастак і якія запалі яму ў памяць. Рысы ўніверсальнасці ўласцівыя і людзям, якія гэты Горад насяляюць. Ад некаторых гледачоў на выстаўцы я чуў, што людзі на карцінах Уладзіміра Тоўсціка — нейкія “штучныя”: ёсць у іх нешта ад манекенаў — прыгожых і халодных, нешта — ад тэатральных марыянетак…

Такі погляд таксама мае права на існаванне, але мне падаецца, што ўсё ж такі ўніверсальнасць вобразаў Тоўсціка мае рэальны грунт. Ніводны ягоны герой не выдуманы. Кожную намаляваную ім асобу ён ведае асабіста. Гэтага прынцыпу мастак прытрымліваецца яшчэ з часоў стварэння цыкла “Сямейны альбом”, дзе на прыкладзе гісторыі ўласнай сям’і стварыў жывапісную эпапею Мінска і Беларусі наогул першых пасляваенных дзесяцігоддзяў. Але і ў гэтых, вельмі асабістых, прывязаных да канкрэтнага часу і месца творах ёсць такая ўніверсальнасць, гуманнасць, якая робіць іх зразумелымі не толькі беларусам. Зрэшты, людзям вельмі пасуе станоўчы змест ягоных карцін, імкненне бачыць у жыцці прыгожае і добрае.

Я не вазьму на сябе смеласць каментаваць кожную работу выстаўкі паасобку. Ды, зрэшты, яно і не патрэбна. Карціна, што выйшла за межы майстэрні, трапіла ў выставачную залу, пачынае жыць уласным жыццём. Можа, не зусім тым, якое ёй планаваў аўтар. Адно мне падаецца бясспрэчным: карцінам Уладзіміра Тоўсціка наканавана доўгае жыццё. Бо мастак любіць жыццё і імкнецца сваімі карцінамі зрабіць яго больш гарманічным.

З выстаўкі выходзіш з упэўненасцю, што жыццё працягваецца. І вектар — пазітыўны. К

Фатаграфічная калекцыя

Феномен Мінскай школы

У мінулым нумары “К” уражаннямі пра выстаўку беларускіх аўтараў “Мінская школа фатаграфіі 1960-я — 2000-я гг.” у Санкт-Пецярбургу падзяліліся Уладзімір Парфянок і Ігар Саўчанка — беларускія фатографы, якія прынялі ўдзел у праекце па асэнсаванні феномену названага мастацкага перыяду. Днямі рэдакцыя атрымала і меркаванне па згаданай тэме расійскага куратара і фатографа Ігара Лебедзева, ініцыятара стварэння вялікай калекцыі Мінскай школы фатаграфіі ў інстытуцыі суседняй краіны, якое мы апублікуем неўзабаве. Сёння ж прапануем увазе чытачоў шэраг работ беларускіх аўтараў, адабраныя для Дзяржаўнага музейна-выставачнага цэнтра РОСФОТО.

Віктар Каленік (група МЕТА). Без назвы.



Віктар Жураўкоў. "Стары храм".

Аляксандр Угляніца (група МЕТА). Без назвы.

Віктар Жураўкоў. "Каменныя крыжы".

Андрэй Васкрасенскі. "Партрэт фотамастака Уладзіміра Няхайчыка".

Міхаіл Гарус. З серыі "Metaphotos".

Альберт Цехановіч. "Сцяна".

Кацярына Гуртавая. Без назвы.

Сяргей Кажамякін. З серыі "Фантомныя адчуванні".

Уладзімір Парфянок. Без назвы.

Сёння Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь адзначыць Дзень горада Мінска праграмай з назвай **"Вераснёвы вечар"**.

Знянацку і без "візы": журналіст "К" + мясцовы "інсайдар" ва ўстановах культуры

У Іванаве — пра рэдкія кадры, запас на дзесяць гадоў і лёс "Мотальскіх прысмакаў"

На жаль, другі раз запар не ўсё склалася так, як мы задумвалі, плануючы чарговы неаб'яўлены візіт у адзін з раённых цэнтраў, дзе мелі намер азнаёміцца з працай устаноў культуры. У самы апошні момант, спаслаўшыся на форс-мажорныя абставіны, "інсайдар" газеты адмовіўся суправаджаць яе карэспандэнта па адпаведных установах, а значыць, і даць свой бесстаронні каментарый па іх дзейнасці. І каб не "цяжкая артылерыя", погляд на канкрэтную культурную прастору знутры быў бы няпоўным. Але пра ўсё — па парадку... Сёння знаёмімся са станам спраў у некаторых установах сферы ў Іванаве.

Алег КЛІМАЎ
Мінск — Іванава — Мінск

Дык што, культурай

Канцэрты са слязамі і новае жыццё "…Прысмакаў"

На ганку Раённага цэнтра культуры і народных традыцый нешта разгружалі ды ўносілі ўнутр будынка. У фае панавала мітусня, сноўдалі людзі. "Напэўна, і тут рамонт", — падумаў я, прыглядаючыся да падлогі ды сцен, шукаючы сколы, свежазатынкаваныя трэшчынкі ды іншыя яго прыкметы. І амаль не памыліўся. Рамонт і мадэрнізацыя РЦКіНТ патрэбны. (А як патрэбны яны дзясяткам дамоў культуры, музеяў, ДШМ, тэатраў… — пра гэта не стамлюся пісаць.) Урэшце, у якім аб'ёме і калі працэс завіруе напоўніцу, вырашыць мясцовая выканаўчая ўлада, адкрыўшы сейф з бюджэтнымі асігнаваннямі. А калі на ўсё адразу грошай не хопіць, дык крэслы ў глядзельнай зале я параіў бы замяніць найперш...

— З'яўляемся цэнтрам культурна-масавай работы ў горадзе і раёне, курыруем дзейнасць сельскіх устаноў культуры, — дала мне ўводныя звесткі дырэктар РЦКіНТ Ніна КУЛІЧ. — Пры Цэнтры працуюць восем калектываў, якія носяць званне "народны" (усяго такіх у раёне амаль утрая больш: дваццаць тры), а таксама адзін са званнем "Заслужаны аматарскі калектыў". Да гэтага ліку дадайце шматлікія гурткі, тэатр моды. Усяго ж наведвае такія фарміраванні ва ўстанове больш за 500 чалавек…

Ну і ці варта казаць, што Цэнтр культуры праводзіць шмат праграм, разлічаных на публіку самую шырокую. Так, з дзвюхгадзінным канцэртным турам "Калядны калейдаскоп" — своеасаблівай творчай справаздачай за год — артысты Цэнтра і вядучыя калектывы раёна аб'ехалі ўсе аграгарадкі Іванаўшчыны. Праект "Сцежкамі даўніны" ў рамках акцыі "Ноч музеяў" пазнаёміў з артэфактамі са скарбніц раёна і не толькі. "Ноу-хау" ўстаноў культуры раёна сталі Клубы творчай моладзі ў іх (аналагі КВЗ), фінальныя гульні якіх праходзяць у Дзень моладзі. Працягвае сваё шэсце па Іванаўшчыне і праект "Палескі гасцінец", які стартаваў на пачатку Года гасціннасці ды знаёміць з рэгіянальнымі асаблівасцямі населеных пунктаў. З гэтай нагоды кожная занальная творчая група (іх створана пяць) прэзентуе сваю праграму, куды ўваходзяць і канцэрт, і паказ рэгіянальнай абраднасці, і выстаўкі майстроў...

— А вось пра што нас шмат пыталіся, дык пра тое, чаму ў 2014-м не было фэсту "Мотальскія прысмакі", — кажа мне Ніна Пятроўна. — А справа ў тым, што мы вырашылі прапанаваць новы творчы праект, каб, акрамя дэгустацый, прадэманстраваць і багацце вырабаў народных рамёстваў. Форум атрымаў назву "Летнік рамёстваў". У яго рамках ахвотныя маглі наведаць аграсядзібы, дзе знаёміліся з гаспадаркай, назіралі абрады, спрабавалі сябе ў стварэнні вырабаў з гліны, саломкі, дрэва. А "...Прысмакі" цяпер станем праводзіць, хутчэй за ўсё, раз на два гады…

З трапятлівасцю ставяцца ў ЦКіНТ да паездак у аўтаклубе-бібліобусе па маланаселеных вёсках раёна. Асабліва хвалюючыя канцэрты праходзяць непасрэдна ў дамах пажылых людзей, а то і ў бальнічных палатах. Вось ужо сапраўды — радасць са слязамі на вачах. Па абодва бакі імправізаванай сцэны...

Акрамя бюджэтных сродкаў, Цэнтр сёлета мае план платных паслуг у 275 мільёнаў рублёў. Акрамя канцэртнай дзейнасці і шэрагу платных гурткоў, на скарбонку спрацоўвае і прадастаўленне плошчаў пад выстаўкі з кірмашамі. Чакаючы рамонту, яшчэ ў Цэнтры спадзяюцца, што ім выдзеляць фінансы і на набыццё сцэнічных касцюмаў для хору, а пакуль, як водзіцца на культурнай Беларусі, абшываюць сябе і паднаўляюць гардэроб з дапамогай усіх магчымых сродкаў. "З залы глядзіцца, быццам новае..." — ці то замілоўваецца, ці то сумуе Ніна Куліч. Затое радуе той факт, што бліжэйшым часам папоўняць актывы новыя камп'ютары і мікрааўтобус.

Сяброўства сяброўствам...

Дзіцячая харэаграфічная школа мастацтваў размяшчаецца ў тым жа будынку, што і ЦКіНТ. Установы сябруюць, бо ў Цэнтры — не ў прэтэнзіі, што яму як бы давялося падзяліцца ўласнымі метрамі. Часам ён аддае і сцэну для заняткаў навучэнцаў школы. Сябруюць і творча: часцяком вучні ДХШМ прымаюць удзел у праграмах ЦКіНТ. Агульнае ва ўстаноў і нятворчае: рамонт таксама не абмінуў школу...

— У вобласці не шмат такіх устаноў, хоць у насельніцтва яны запатрабаваныя, — тлумачыць дырэктар ДХШМ Людміла САМАХАВЕЦ. — Так, нашу школу наведвае 185 дзяцей ва ўзросце ад 8 да 14 гадоў і яшчэ каля 80 (6-7 гадоў) — на падрыхтоўчым аддзяленні. Кошт навучання, адпаведна, — 50 тысяч і 85 тысяч рублёў у месяц. Маем філіял у вёсцы Махро, дзе навучаюцца 26 чалавек. Пасля далейшай адукацыі (як правіла, у Пінскім і Гродзенскім каледжы мастацтваў) некаторыя з выпускнікоў вяртаюцца да нас як выкладчыкі. А зараз прыйшло пяць маладых спецыялістаў…

Перыядычна працуе гурток аэробікі, які прыносіць, разам з канцэртнай дзейнасцю, пазабюджэтныя сродкі. Сярэдняя заработная плата ва ўстанове складае каля чатырох мільёнаў рублёў.

На матэрыяльна-тэхнічную базу Людміла Васільеўна не скардзіцца, адзначаючы пры гэтым, што пастаяннага абнаўлення патрабуюць абутак і касцюмы. І тут спрыяе апякунскі савет: хтосьці з яго членаў дапамагае фінансава, хтосьці купляе тканіну ці шые сам… І хочацца, усё ж такі хочацца дырэктару, каб у ДХШМ было сваё асобнае памяшканне!..

Абсалютны эксклюзіў

А вось у Дзіцячай школы мастацтваў і народнай дэкаратыўна-прыкладнай творчасці (ва ўжытку і раскручаная назва — Школа бондарства) яно ёсць: невялікі ўтульны будынак. Тут падлеткаў 12 — 15 гадоў не толькі вучаць рабіць посуд, але і адраджаюць збольшага забы-

Дырэктар Школы мастацтва Святлана Каюдзіч.

Дырэктар ЦКіНТ Ніна Куліч.

Дырэктар Школы бондарства Наталля Гацэвіч.

Дырэктар ДХШМ Людміла Самахавец.

На людным месцы

Свята для палешукоў

Абласное свята мастацтваў "Палескія сустрэчы", старт якому быў дадзены ў мінулым годзе, 12 верасня зноў сабрала сяброў. Адметнасць сёлетняга фестывалю ў тым, што ён праходзіць у рамках Года гасціннасці.

ЛЮБАНШЧЫНА

Сёлета наш край адзначае 90-годдзе стварэння Любанскага раёна, 70 гадоў вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 55 гадоў з часу адкрыцця на Любаншчыне цэнтра музычна-эстэтычнага выхавання — музычнай школы (сёння гэта дзіцячая школа мастацтваў).

Да юбілею раёна хлебаробы Любаншчыны намалацілі 90 тысяч тон збожжа. У рамках свята адбылося ўшанаванне пераможцаў жніва і, вядома, — вялікая канцэртная праграма з удзелам Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра пад кіраўніцтвам народнага артыста краіны, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі, прафесара Міхаіла Фінберга. Праграма прадугледжвала і класіку, і эстраду, і джаз. "Мы аднолькава ставімся да ўсіх кірункаў, галоўнае — каб музыка была напісана і выканана прафесійна, а таксама мела нацыянальную аснову", — канстатаваў маэстра.

Міхаіл Фінберг і яго аркестр на леташняй імпрэзе.

"Палескія сустрэчы" прэзентавалі кнігу доктара мастацтвазнаўства, прафесара Вольгі Дадзіёмавай "Музычныя промні Любані ў залатым коле Міншчыны". Як лічыць аўтар, беларуская культура моцная сваімі малымі гарадамі. Так склалася гістарычна, таму лагічна, што менавіта на іх базе развіваецца фестывальны рух. Фестываль носіць асветніцкі характар, імкнецца прыцягнуць моладзь у музыку, у нацыянальнае мастацтва. І менавіта ў Любанскай школе мастацтваў распачнуцца сустрэчы з музыкантамі ансамбля флейтыстаў Нацыянальнага акадэмічнага аркестра.

Адметнасць фэсту — сустрэча з юнымі тэленавітымі мастакамі школ мастацтваў Міншчыны ў рамках абласной "АРТ-сесіі", узнагароджанне і канцэрт лаўрэатаў рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

Свята доўжыцца на трох пляцоўках: у Любанскай дзіцячай школе мастацтваў, Сароцкім сельскім доме культуры і на цэнтральнай плошчы. Цудоўным падарункам для меламанаў стай канцэрт беларускай класічнай музыкі "Любанскія мары Станіслава Манюшкі", прысвечаныя 195-годдзю з дня нараджэння кампазітара.

Васіль КАТКАВЕЦ,
начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Любанскага райвыканкама

Вяселле лічыцца адным з найважнейшых элементаў жыцця, таму падыходзяць да яго арганізацыі вельмі сур'ёзна. Згодна з традыцыямі, нашы бабулі і дзядулі бралі шлюб па-іншаму, не так, як моладзь сёння.

МАЛАРЫТА

— А ці можна цяпер узяць шлюб у Маларыце, які цалкам адпавядаў бы народнаму стылю? — задаю пытанне начальніку аддзела ЗАГС Маларыцкага райвыканкама Людміле Гарбацэвіч.

— Калі ёсць цікавасць да мінулага, чаго б не прапанаваць і такую паслугу? Вясельны абрад па-ранейшаму: маладых сустракаем хлебам-соллю. Яны становяцца на ручнік, цалуюць каравай, абменьваюцца пярсцёнкамі,

Урачысты вечар **"Яшчэ адзін крок наперад"** з нагоды 70-годдзя заснавання Музея Янкі Купалы адбудзецца 19 верасня.

Літаратурна-музычная гасцёўня ў ЦКіНТ, у якой, сярод іншага, праводзяцца ўрачыстыя рэгістрацыі шлюбаў. А гэта — капейчына ў скарбонку ўстановы.

— не захапіць?

тае рамяство, якім славіўся і славіцца Іванаўскі раён. Школа — адзіная ў рэспубліцы, што спецыялізуецца толькі на дадзеным промысле.

— Бондарства ў нас, — сцвярджае дырэктар Наталля ГАЦЭВІЧ, — гэта не нейкі выставачны элемент, які мае адно прэзентацыйнае прызначэнне. Вырабы — запатрабаваныя, у нас столькі заказаў, што выканаць іх усе мы не ў сілах. Гандлюем прадукцыяй на выстаўках-продажах. Больш за тое: да нас прыязджаў чалавек з Расіі і прасіў арганізаваць у адным з раёнаў яго краіны навучанне гэтаму рамяству…

На пытанне, ці жаночы тое занятак, Наталля Міхайлаўна кажа, што не ведае "правільнага" адказу. Але сярод вучняў установы няма дзяўчат. Парадаксальнасць жа сітуацыі заключаецца ў тым, што юных іванаўскіх прадстаўніц прыгожага полу, якія жадаюць авалодаць гэтым уменнем, — з лішкам! Чаму іх не прымаюць у школу, ніхто мне дакладна растлумачыць так і не змог. Але! На пятнаццатым годзе яе функцыянавання, магчыма, дзяўчатам дадуць "зялёнае святло" — пакуль як эксперымент, для пачатку дапусціўшы іх да роспісу па дрэве, адкрыўшы адпаведнае аддзяленне.

Наталля Гацэвіч лічыць, што меркаванне, якое мае месца да гэтага часу, — нібыта ва ўстановы, дзе з юных гадоў вучаць працы рукамі, "высылаюць", у асноўным, дзяцей з няшчасных сем'яў і ўжо вядомых не з лепшага боку міліцыі, — памылковае. "Так, і ў нас былі "цяжкія падлеткі", — спярша нібыта пагаджаецца яна, але потым развівае думку: — Але гэта прыватнасці. Ёсць тыя, хто ў агульнаадукацыйнай школе вучыцца на тройкі, але ў нашай яны становяцца выдатнікамі! Таму што тая школа не можа ім даць магчымасць у поўным аб'ёме рэалізаваць іхнія творчыя схільнасці".

У дрэве, якое закупляюць для ўстановы пераважна ў Іванаўскім лясніцтве, недахопу няма. Дый на брак чагосьці яшчэ з матэрыяльнага Наталля Міхайлаўна асабліва не наракае, ва ўсялякім выпадку, абсталяванне і інструментарый, дзякуючы якім з'яўляюцца розныя вырабы, знаходзяцца ў працоўным стане і перыядычна абнаўляюцца. Ёсць жа праблема глабальная: у нашай краіне не рыхтуюць кадры, якія маглі б выкладаць бондарскае рамяство. Разам з Гацэвіч у Школе працуюць пяць настаўнікаў. Маладых спецыялістаў навучаюць бондарству менавіта тут, на практыцы. Мабыць, калі каму-небудзь з тых, хто прымае рашэнні ў маштабе дзяржавы, падасца, што бондарства ў Беларусі можа мець прамысловы патэнцыял, тады і настаўнікаў гэтаму мастацтву пачнуць рыхтаваць у спецыялізаваных установах.

А вазьміце дуду!

У Дзіцячай школе мастацтваў выкладчыкаў рыхтуюць і для сябе, і для "таго хлопца", прычым ужо рыхтуюцца і да ўласнага юбілею.

— Налета Школа адзначыць 50-годдзе, — кажа дырэктар Святлана КАЛОДЗІЧ. — Ёсць чым ганарыцца! Вось хоць бы кубкам, які быў уручаны нашаму вакальнаму ансамблю хлопчыкаў "Next" як Гран-пры на Міжнародным фестывалі-конкурсе дзіцячай і маладзёжнай творчасці "Вясёлка над Віцебскам" у рамках апошняга "Славянскага базару…". Планы? Калі адчуем попыт, хочам паспрабаваць адкрыць новыя класы — па навучанні ігры на віяланчэлі ды флейце, — а можна арганізаваць і тэатральнае аддзяленне…

Апошніх сёння ў школе — восем, на якіх у 54 выкладчыкаў праходзяць навучанне ў залежнасці ад узросту (6-11 гадоў) на працягу 5-7 гадоў 377 навучэнцаў з усяго раёна (сярэдні кошт навучання — 60 тысяч рублёў), 77 (ва ўзросце 5-7 гадоў) — на падрыхтоўчым аддзяленні (аплата — 35 тысяч). А дзятва вёскі Яечковічы атрымлівае спецыяльную пачатковую адукацыю ў адкрытых летась мастацкім класе і класе акардэона на месцы. На жаль лідара гурта "Стары Ольса" Дзмітрыя Сасноўскага на дудзе граць у ДШМ не вучаць. А паводле шматгадовых пошукаў тэарэтыка-музыканта, дуда з'яўляецца ледзь ці не прамаці ўсіх інструментаў свету, і радзіма яе — мы! Мо варта ўзяць "на заметку" кіраўніцтву школы і гэты інструмент?..

Нейкіх сталых праблем, як і тых, якія ўзнікаюць перманентна, у працы ўстановы Святлана Міхайлаўна не бачыць: "Калі патрабуецца нейкая дапамога, улады заўсёды ідуць нам насустрач. Гэта датычыцца, напрыклад, набыцця інструментаў. Нам нават нагадваюць, што час абнавіць той або іншы "парк"! А ў наступным годзе плануецца распачаць капітальны рамонт школы…"

Ну а пазабюджэт у ДШМ зарабляюць толькі канцэртнымі выступленнямі. "Мая прынцыповая пазіцыя заключаецца ў тым, што там, дзе дзеці, для ўстаноў культуры не можа існаваць іншых спосабаў прыцягнення фінансаў, — пераканана Святлана Калодзіч. — Ніякай здачы памяшканняў у арэнду!.. Ды нам і здаваць, прызнацца, няма чаго..."

Ад глабальнага да канкрэтнага

Пакуль вы асэнсоўваеце тое глабальнае, пра што выказаўся Уладзімір Шэляговіч, я ў завяршэнне накідаю некалькі прапаноў аб канкрэтнай моладзі — іванаўскай.

На дыскатэкі ў ЦКіНТ ходзяць "складана" — таксама, у тым ліку, вінаваты Інтэрнэт. А яшчэ адна з прычын — асноўны кантынгент "дыскачоў" можа прысутнічаць на іх да 22.00. Асабіста мне ў мае камсамольскія гады гэтага хапіла б з лішкам, цяперашняя ж моладзь прывыкла "тусіць" да ўпору. Таму "ўпор" і падбіраецца ёй такім чынам, каб яго не даводзілася перарываць ў самы гарачы момант. "Танцавальныя вечары да пэўнай гадзіны" адразу ж перастаюць быць цікавымі. І што ж прыйшло на замену танцам? Добра, каб менавіта сеткавыя рэсурсы. Наогул, як мне казалі кіраўнікі іванаўскіх устаноў культуры, захапіць чымсьці са сваёй сферы цяперашнюю моладзь у цэлым (у цэлым, падкрэсліваю) вельмі цяжка: "Нейкая яна інертная пайшла, пасіўная. Трэба прыкласці масу намаганняў, праявіць асаблівую фантазію, прапанаваць нестандартныя хады і формы, каб падлеткі адгукнуліся..."

Фота аўтара

Каментарый зацікаўленай асобы

І абяцаны погляд знутры ад "цяжкай артылерыі" — былога начальніка аддзела культуры Іванаўскага райвыканкама Уладзіміра ШЭЛЯГОВІЧА, які ён узначальваў трыццаць гадоў!

— Горад і раён жывуць паўнавартасным культурным жыццём. У маю бытнасць начальнікам аддзела культуры мы вельмі сур'ёзна падыходзілі да падбору кадраў. Большая іх частка прыходзіла ў нашы ўстановы культуры свядома і з жаданнем працаваць, а не, скажам, адпрацаваць размеркаванне ды хуценька сысці. Мы імкнуліся стварацьтакія побытавыя ўмовы маладым спецыялістам, каб яны не аказвалі адмоўнага ўздзеяння на іхнюю дзейнасць. Прадастаўлялі інтэрнат, ніколі не пакідалі без увагі пытанне заработнай платы. З інструментамі, касцюмамі, рэквізітам праблем не існавала. Таму і аддача была адпаведная. Поспехі былі і ёсць — як на рэспубліканскім узроўні, так і на міжнародным. Лічу, яшчэ гадоў на дзесяць у нас ёсць запас прафесійных, адказных, улюбёных у справу людзей.

Не стану крытыкаваць пэўныя ўстановы. Хоць здаралася ўсялякае. Напрыклад, некалькі гадоў таму план платных паслуг успрымаўся з абурэннем, а цяпер ён лёгка перавыконваецца. Таму што ёсць моцныя калектывы. І тыя праблемы, якія ўзнікалі ды ўзнікаюць, вырашаліся і, упэўнены, вырашаюцца ў рабочым парадку. Дый няма такіх праблем, каб пра іх трэба было б казаць гучна. Але ёсць праблемы ў культуры наогул.

Першая: падрыхтоўка работнікаў у сферы. Старое пакаленне сыходзіць, а замену яму знайсці не заўсёды атрымліваецца. Гэта ў Іванаве і раёне ўсё нібыта добра, але і тут апошнім часам я сутыкаўся з тым, што таленавітую моладзь усё цяжэй угаварыць прадоўжыць навучанне ў спецыялізаваных установах. Яна выбірае іншыя прафесіі, а прэстыж нашай падае. А я ведаю вобласці, дзе кадравае пытанне стаіць востра! Гэта другая праблема: нізкі заробак. Калі яе не пачаць вырашаць у найбліжэйшы час, дык, баюся, можам атрымаць негатыўныя з'явы ды наступствы ў галіне культуры. Трэцяя: недастатковае фінансаванне ўстаноў. У прыватнасці, на іх утрыманне і рамонт. Сродкі, якія накіроўваюцца на гэтыя патрэбы, не супастаўныя ў працэнтных адносінах з тымі грашыма, што вылучаліся раней. Жыллё. Дзейнічае Указ Прэзідэнта, у якім, сярод іншага, гаворыцца пра ўмовы льготнага крэдытаванні маладых сем'яў. Не першы год ходзяць размовы, што трэба было б распрацаваць і дакумент, у якім гаварылася б пра льготнае крэдытаванне жылля для маладых спецыялістаў…

Стары абрад? Калі ласка!

Людміла і Андрэй Гарбацэвічы ў Маларыцкім строі. / Фота аўтара

каравай перадаецца свату… Пры жаданні маладых можна ўнесці і іншыя элементы рэгістрацыі шлюбу. Трэба памятаць, што ў ЗАГСе праходзіць толькі адна абавязковая частка вяселля. Усё астатняе — па-за межамі нашых сцен. Аднак неабходна памятаць, што ў кожнай мясцовасці былі свае асаблівасці, традыцыі правядзення вяселля…

"Па-за межамі" ЗАГСа маладым дапамагае і Маларыцкі раённы цэнтр народнай творчасці. Яго кіраўнік, Валянціна Струнец, кажа, што ў іх ёсць узоры і ранейшага шлюбнага адзення маладых, і адноўленыя народнай майстрыхай з Дарапеевіч Сцепанай Сцепанюк. Клубнікі нават дапамагаюць спячы каравай.

Мікалай НАВУМЧЫК
Маларыта

Віцебскі абласны метадцэнтр народнай творчасці выпусціў альбом "Людміла і Валерый Кавальчукі — керамісты Віцебска" з серыі "Культурныя праекты", прысвечанай Году гасціннасці.

ВІЦЕБСК

Старшыня рэдакцыйнага савета па выданні кнігі, выпушчанай пры фінансавай падтрымцы галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкама, — кандыдат мастацтвазнаўства, дактарант Цэнтра даследавання беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук, вядучы метадыст АМЦНТ Людміла Вакар адзначыла, што Кавальчукі абагульнілі вопыт работы па развіцці керамікі Віцебшчыны ад 80-х г. XX стагоддзя і да нашых дзён.

Гасцінная кераміка

Майстры ўвайшлі ў гісторыю мастацкай культуры Віцебска як аўтары ўнікальных твораў, стваральнікі сервізаў вытворчага фарфору, удзельнікі і арганізатары пленэраў керамікі. У іх творчасці спалучаюцца класічная культура фарфору XX стагоддзя і сучасныя эксперыменты з формай і матэрыялам.

Ала ЛЯЛЬКІНА,
вядучы метадыст
Віцебскага абласнога
метадычнага цэнтра
народнай творчасці

Будзем на сувязі!

Паважаныя чытачы!

Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах нумара.
Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77, альбо на электронную скрыню kultura@tut.by,
тэлефануйце ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97,
абмяркоўвайце на
facebook.com/kimpressby, vk.com/kimpressby, twitter.com/kimpressby
odnoklassniki.ru/group/52156879339702

Міністэрства культуры Беларусі і Міністэрства культуры і мастацтваў Шры-Ланкі падпісалі **Пагадненне аб супрацоўніцтве**.

Тактыка культурнага развіцця

“Імяніны” і кірмаш: суадносіны сіл

Субота і нядзеля мінулага тыдня сталіся для Заслаўя і яго гасцей суцэльным святам. У гістарычнай частцы горада віраваў кірмаш, дзе можна было набыць творы народнага мастацтва і рэчы, патрэбныя ў побыце. Бадай праз кожныя дзесяць метраў — імправізаваныя кавярні ды атракцыёны. Музыка, спевы, танцы ў выкананні прафесійнікаў і аматараў, сябры рыцарскіх клубаў у латах і іхнія паненкі ў шыкоўных аксамітавых строях… Абвешчанае сталіцай чарговага Дня пісьменства Заслаўе гуляла напоўніцу!

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Моманты свята. / Фота Пётры ВАСІЛЕЎСКАГА

Горад, як мае быць, да свята прыхарошылі — не толькі цэнтр, але і прылеглыя раёны. Кульмінацыяй свята стала адкрыццё помніка князю Ізяславу, які, паводле летапісцаў, за справамі дзяржаўнымі не забываўся на асвету ды кніжную навуку. Такім і стаіць цяпер бронзавы Ізяслаў на пастаменце: з мячом, знакам княжацкай улады, у адной руцэ і з кнігай — у другой. Ягоная постаць — як ілюстрацыя да тэзы “Беларусы — нацыя Кнігі”. Добрая традыцыя ўстаноўкі ў сталіцах нацыянальнага Дня пісьменства помнікаў выдатным гістарычным асобам, сейбітам на ніве вечнага, займела працяг у Заслаўі.

Згадваючы святочны настрой, што панаваў у горадзе тымі днямі, і пазітыўныя эмоцыі, якімі ўзбагаціліся гаспадары ды госці свята, мушу, аднак, адзначыць, што літаратурны чыннік апошняга не заўжды ўспрымаўся як галоўны, прытым што зроблена ўсё было нібыта правільна. Ахвотныя маглі азнаёміцца з лепшымі кнігамі беларускіх выдавецтваў у спецыяльным павільёне. Кніжны гандаль у святочныя дні быў непараўнальна шырэйшы, чым у звычайныя. На розных пляцоўках Кнігу перад гледачамі/слухачамі ўслаўлялі артысты ды пісьменнікі. Але… Некаторыя сцэны, дзе выступалі народныя калектывы і літаратары, так і не зведалі наплыву гледачоў. Часам падавалася, што не кірмаш быў пры свяце кнігі, а “кніжныя імяніны” — пры кірмашы. Дарэчы, падобнае мне запомнілася і па іншых Днях пісьменства, якія давялося наведаць…

Гэтая сітуацыя нагадала эпізод з майго школьнага дзяцінства. Павялі неяк нас, вучняў малодшых класаў, “культпаходам” у бліжэйшы Дом культуры: глядзець нейкае кіно. А да пачатку сеанса перад намі выступаў рэдактар ці то “Бярозкі”, ці то “Вясёлкі” з прэзентацыяй, як сказалі б сёння, свежага нумара часопіса. Яго, натуральна, ніхто не слухаў. Нават не глядзелі ў ягоны бок. Мне, памятаю, было шкада гэтага чалавека, які, безумоўна, пакутаваў ад усведамлення, што ён тут лішні. Прыблізна так, мяркую, мусілі пачуваць сябе пад час Дня пісьменства беларускія літаратары, якія прамаўлялі перад публікай, што сабралася тут зусім не для таго, каб іх слухаць. Я гэта да таго, што для ўспрымання Слова патрэбна стварыць спрыяльныя ўмовы… Бо напачатку было ўсё-такі Слова.

Самым цікавым на сёлетнім Дне пісьменства мне падалася магчымасць адчуць сябе друкаром часоў Скарыны. Ля ўзноўленага паводле старажытных ўзораў варштата стаяла вялікая чарга ахвотных зрабіць сваімі рукамі друкарскі адбітак. Тут жа побач можна было пабачыць, як паводле старажытнай тэхналогіі робіцца папера. Пасля такога атракцыёну сёй-той і да кнігі будзе ставіцца з большай павагай!..

Відаць, можна было скласці праграму святкавання такім чынам, каб госці маглі паглядзець усё цікавае, не рызыкуючы спазніцца на апошнюю электрычку. А гэта было няпроста, калі ўзяць да ўвагі, што тое ж афіцыйнае адкрыццё помніка князю Ізяславу адбылося а 20-й, а цырымонія адкрыцця свята пачалася ў 20.30 і доўжылася да 22-й гадзіны. Зразумела, імпрэза пад начным небам пры спецыяльным асвятленні можа быць вельмі эфектнай. Але мала хто яе дачакаўся, калі прыехаў у Заслаўе зранку…

Мае заўвагі “на палях” нататніка свята ніякім чынам не ставяць пад сумнеў значнасць апошняга. Яно мусіць крочыць па краіне, сцвярджаючы, што ў Беларусі няма культурнай правінцыі. Але давайце ўсё ж не забываць, што на двары — XXI стагоддзе, з тэлебачаннем, Інтэрнэтам ды іншымі глабальнымі рэчамі. Як у гэтых умовах прывабіць чалавека словам Купалы і Караткевіча? Мабыць, на гэтай задачы і трэба будаваць рэжысуру Дня пісьменства, якое налета прыме Шчучын.

К

“Чыстыя” з-пад “нажніц”

І саснілася мне **вакансія**… Ды хто яе выбера?

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 7.)

Крыштальна “чыстая” зарплата

Стаміўшыся адшукваць логіку ў стракатых сумах заробку, звярнуўся па кансультацыю да спецыялістаў. Спачатку патэлефанаваў у райцэнтр А., у мясцовы аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі. Запытаўся ў эканамістаў: “Кожнаму з чатырох патрэбных хормайстраў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй вы абяцаеце плаціць за месяц па 2 291 329 рублёў. А вось аддзел райцэнтра Б. пры тых жа ўмовах прапаноўвае хормайстру 1 700 000. Чаму такія “нажніцы”?”. Спецыялісты з пункта А., зверыўшыся з дакументацыяй, адказалі: “А ў нас пададзены “гразны заробак”. Які ж тады “чысты”? “Два мільёны сто тысяч”, — адказалі зэльвенцы. “Дык усё роўна ад ельскай зарплаты адрозніваецца”, — ніяк не магу разабрацца ў эканамічных сакрэтах. Мне цярпліва (што ўзяць з хормайстра, якім, каюся, прадставіўся!) тлумачаць, што 300 — 400 тысяч розніцы ў прапаноўваемых заробках.

Тэлефаную ў райцэнтр Б. Аказваецца, хормайстарскія мільён семсот тысяч — “чыстыя”, ды плюс яшчэ з даплатай і прэміяй. Калі працаваць давядзецца ў сельскай мясцовасці, спецыяліста чакае “вясковая” надбаўка. Усё роўна да заробку ў А. сума трохі не дацягвае. Тэлефаную знаёмаму эканамісту, які меў калісьці пэўнае дачыненне да сферы культуры. І высвятляю тое, што хацеў. У сувязі з тым, што аддзелаўскія структуры паўсюль займелі статус юрыдычных асоб, пашырылі маштабы пазабюджэтнай дзейнасці, дык і дадатковыя магчымасці ў іх з’явіліся для ўмацавання фонду заработнай платы. Інакш кажучы, у кожнага аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі — сапраўды свая адметная эканоміка. Таму і заробкі для аднолькавых штатных адзінак — крыху розняцца. Паколькі на рынкавую эканоміку арыентуемся, таму і маем тое, што маем…

Так што, спецыялісты, калі прагнеце запоўніць вакансію, не надта верце адпаведным сайтам. “Сядайце на тэлефон”, турбуйце бухгалтэрыі, старанна высвятляйце ісціну, не губляйце свае перспектыўныя тысячы і сотні… Але вось ці існуюць у прыродзе тыя, да каго я цяпер звяртаюся? Не ўпершыню пішу пра тое, што кадры нашы састарэлі, таму ў пэўнай ступені страцілі актыўнасць ды ініцыятыўнасць. На сяле працуюць у асноўным практыкі. Дакладней, не працуюць, а дапрацоўваюць. Азы чалавечай псіхалогіі: калі работнік не адчувае істотнай увагі, выражанай у прыстойным грашовым эквіваленце штомесячнага заробку, дык асноўнай рысай характару работніка становіцца абыякавасць. Больш разбуральную якасць цяжка ўявіць. Тым больш у адносінах да такой тонкай матэрыі, як культура. Не вельмі суцяшальная выснова.

Дык дзе ж выйсце?

Гэта, падаецца, закон дыялектыкі: чым больш у аддзела вакансій, тым меншай становіцца якасць аказваемых насельніцтву культурных паслуг. Не з вакансіяй трэба змагацца. Чым стары пінжак лапіць, дык лепш новы прыдбаць. А “новы пінжак” мы ўжо насілі. Я пісаў на пачатку артыкула, што было калісьці для маладых спецыялістаў і добраўпарадкаванае жытло, і належная ўвага на пачатку працоўнай дзейнасці, і прэстыж носьбіта беларускай нацыянальнай культуры.

Давайце паставім сябе на месца маладога спецыяліста, да прыкладу, хормайстра, пасля заканчэння, скажам, ССНУ. Стажу — аніякага, досведу — кот наплакаў (з практычным навучаннем і ў ВНУ — вялікія праблемы), што такое вёска — не ведаю, пра камунікабельнасць — толькі лекцыйныя няўцямныя ўспаміны, настаўніка ў мяне няма, бо апошнім часам на сяле гэтым ніхто не займаўся, таму хор — даволі рэдкая цяпер з’ява… Ну і каму я такі патрэбны? Адпрацоўка ператвараецца ў пакуту, прага кар’ернага росту і далейшага завочнага навучання знікае ўвобмірг, а абраная калісьці прафесія ператвараецца ў спецыфічнае захворванне, галоўны сіндром якой — боязь самавыяўлення. Вось вам і абыякавасць.

> З шэрагу раёнаў мы гадамі не атрымліваем звестак. Работнікам культуры няма пра што пісаць, няма чым хваліцца. І, на мой погляд, гэта больш чым трывожны сіндром. **Што яму можна супрацьпаставіць?** Толькі заробак, жытло, сапраўды якаснае практыка-арыентаванае навучанне. Інакш разам з вёскай згубім і культуру.

ў апошнюю суму авансам, так бы мовіць, уключаны прэмія і надбаўка. А раптам не заслужу? “А вы пастарайцеся!” Абяцаю пастарацца.

Вось такая "замануха". Ніякім чынам не хачу запляміць з гэтай нагоды нашы аддзелы ды іх эканамічна-бухгалтарскія службы. Яны малайцы: стараюцца як могуць, каб займець у штат прафесіянала. Для гэтага, згодны, любыя сродкі — апраўданыя. І толькі таму, што мэта тут — больш чым высакародная: быць нашай сельскай культуры баявітай ды эфектыўнай ці не быць. Інакш кажучы, той выплыве з “аптымізацыйнага” віру, хто пабольш спрактыкаваных “плыўцоў” назапасіў. Тым больш, што “чысты” заробак, па вялікім бухгалтарскім рахунку, адрозніваецца ад “гразнага” прыблізна так, як прафесія харэографа ад прафесіі балетмайстра.

Прыярытэты — у каго

Я цудоўна разумею і тое, што выстаўляць “чысты” заробак на сайт вакансій іншым разам проста сорамна. Але давайце будзем шчырымі да канца. Ну такая вось ява ў нашай “культурнай” эканомікі. І часцяком наш жыццёвы выбар залежыць ад

Абыякавасць — заразная

Ці не па той прычыне з шэрагу раёнаў мы гадамі не атрымліваем звестак. Работнікам культуры няма пра што пісаць, няма чым хваліцца. І, на мой погляд, гэта больш чым трывожны сіндром. Што яму можна супрацьпаставіць? Толькі заробак, жытло, сапраўды якаснае практыкаарыентаванае навучанне. Інакш разам з вёскай згубім і культуру.

А пакуль… Па стане на 8 верасня аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Зэльвенскага райвыканкама, калі верыць камп’ютарным звесткам пра наяўнасць вакансій на сайце Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь, ладзіць не надта паўнацэнныя танцавальныя вечары: не стае кіраўніка (з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй) музычнай часткі дыскатэк. Прапаноўваемы заробак — 1 мільён 900 тысяч рублёў. Напэўна, “гразнымі”.

К

ф о т а ф а к т

"Паўлінка" + фота

Пад час гастролей у расійскім Томску артысты Купалаўскага тэатра не толькі паказалі класічную "Паўлінку" на той сцэне, дзе спектакль пабачыў свет у 1944 годзе, але і прыгадалі папярэднія гастролі сваёй трупы тут у 1985 годзе праз архіўныя фота, што захаваліся ў сібірскім калектыве. Пасля гэтай гастрольнай паездкі "купалаўцы" прадоўжаць сезон на роднай сцэне. Ну а тамічы, вядома, пабачылі і некаторыя іншыя спектаклі знакамітага тэатра з яго цяперашняга рэпертуару. / **Фота прадастаўлена Нацыянальным акадэмічным тэатрам імя Янкі Купалы**

А вы накцюрн сыграць змаглі б… на звычайным бярозавым палене? Аляксандр ЗУБКО — можа. Сёння ён — лаўрэат міжнародных конкурсаў, саліст аркестра Дзяржаўнага ансамбля танца Беларусі, а яшчэ — артыст, які ўдзельнічае са сваёй унікальнай праграмай у шматлікіх фальклорных фестывалях як на Беларусі, так і за мяжой. Адно з яго апошніх выступленняў на фэсце "Прымацкая бяседа", што адбылося ў польскім гарадку Міхалова, выклікала сапраўднае захапленне ва ўсіх прысутных… І нездарма, бо Аляксандр Зубко ўмее здабываць музычныя гукі не толькі з пален, а і з драўляных чаравікаў, пральнай дошкі, сялянскай касы ды нават звычайных вясковых чыгункоў… Па дарозе з Польшчы ў Беларусь я дамовіўся з артыстам аб інтэрв'ю для "К".

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Музыка на паленцах і каленцах

Харызматычны артыст "гучыць" нават… у воўчай шкуры

Аляксандр Зубко.

— Я скончыў Беларускую дзяржаўную кансерваторыю па класе ўдарных інструментаў. Працаваў у якасці саліста Нацыянальным акадэмічным народным аркестры імя І.Жыновіча, ансамблі музычных і харэаграфічных мініяцюр "Бліскавіца". Зараз з'яўляюся музыкантам і салістам балета ў аркестры Дзяржаўнага ансамбля танца Беларусі. Яшчэ ў "Бліскавіцы" пачаў выступаць са сваімі незвычайнымі сольнымі нумарамі.

— Але чаму для сольных выступленняў быў абраны такі незвычайны жанр — музычна-эксцэнтрычны?

— Ведаеце, сёння быць проста музыкантам, танцорам — мала. Каб зацікавіць гледача, трэба быць разнастайным. Неабходна быць акцёрам, мець сваю творчую харызму, запамінацца кожным рухам і выступленнем. Усё гэта дае музычна-эксцэнтрычны жанр. У ім я пачуваю сябе разняволеным.

— Але не кожны мае такую харызму і здольнасць так захопліваць гледачоў, як тое рабілі вы ў Міхалове. Якім чынам вы гэтага дасягаеце?

— Адной толькі працай. Трэба пастаянна рэпеціраваць, шукаць, эксперыментаваць, рабіць усё на самым высокім узроўні, мець дасканалыя музычныя здольнасці. І, натуральна, трэба любіць усё тое, што ты робіш. Толькі тады гледачы адчуюць гэта і таксама палюбяць цябе… Да таго ж, на сцэне я імкнуся рабіць сапраўднае шоу. А гэта людзям заўсёды даспадобы.

Тых, хто робіць шоу, у маім разуменні, у беларускай музыцы **можна пералічыць па пальцах.** Чаму? Таму, што гэта ўнікальнае майстэрства, калі кожны нумар цалкам адрозніваецца ад іншага.

— Дзе ж можна навучыцца так рабіць шоу? Можа, вы пасля вучобы ў Акадэміі музыкі, стажыраваліся яшчэ і на Брадвеі?

— Не, не даводзілася. Але я доўгі час гастраляваў у Паўднёвай Карэі і меў зносіны з тамтэйшымі прафесійнымі рэжысёрамі, якія прайшлі школу Брадвея… Яны мне шмат у чым дапамаглі сваімі парадамі. Дый я таксама нагледзеўся там на вялікую колькасць якасных музычных праграм, на тое, як можна рабіць шоу са сваіх сольных выступленняў... Увесь досвед цяпер выкарыстоўваю пад час сваіх прадстаўленняў.

— Але ж шоу імкнецца рабіць амаль кожны выканаўца…

— Так, але не кожны разумее, што за гэтым словам хаваецца… Бо шоу — гэта не толькі некалькі песень, некалькі рухаў у бакі, успышкі святла ды пусканне дыму на сцэну. Тых, хто робіць шоу, у маім разуменні, у беларускай музыцы можна літаральна пералічыць па пальцах. Чаму? Таму, што гэта ўнікальнае майстэрства, калі кожны нумар цалкам адрозніваецца ад іншага, мае сваю логіку пабудовы, свае, калі хочаце, сюжэт і сцэнарый. Можна сказаць, што нумар у сапраўдным шоу — гэта маленькі спектакль. А каб зрабіць усё гэта, трэба прыкласці вельмі шмат намаганняў… На жаль, беларускія артысты часцяком не шукаюць унікальнасці, а ідуць творчым шляхам па наезджанай каляіне. Я так не раблю, бо мне было б гэта зусім не цікава.

Кажа эксперт

Валянцін ДУДКЕВІЧ, мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага ансамбля танца краіны, народны артыст Беларусі, прафесар:

— На жаль, апошнім часам у свеце назіраецца крызіс народнага танца. Нават вядомыя калектывы часта не паказваюць нічога новага. Да таго ж, у сённяшніх умовах мы вымушаны канкурыраваць з харэаграфічнай эстрадай.

Таму, каб не згубіць гледачоў, асабліва моладзь, варта, на маю думку, шукаць выйсце ў нечым новым, адметным — у тым, што можа прыцягнуць увагу. Мы так і робім, бо разумеем: форма можа быць новай і рознай, а вось змест усё адно застанецца вечным. Таму мы, да прыкладу, ствараем больш сучасныя апрацоўкі танцаў, асвойваем новую лексіку народных рытмаў, надаём значную ўвагу музычнаму афармленню... А выступленні Аляксандра Зубко — таленавітага артыста і акцёра, сапраўднага мастака і прафесіянала — вельмі дапамагаюць нам змагацца за свайго гледача…

— Наколькі я ведаю, у вас падобных "міні-спектакляў" даволі шмат. Акрамя нумара "Паленцы на каленцах" у Міхалове вы выконвалі зусім адрозную праграму, заснаваную на нейкіх язычніцкіх матывах…

— Так. Пакуль гэты нумар (я яго называю "Падарожжа па сусвеце") яшчэ поўнасцю да ладу не даведзены. Так што тое, што вы ўбачылі ў Міхалове, было першай дэманстрацыяй новай праграмы. Звычайна я выступаю з нумарам "Паленцы на каленцах", спецыяльна напісаным для мяне беларускім кампазітарам Аляксандрам Балотнікам.

— А адкуль узялася ідэя гэтага нумара?

— Ідэя "Паленцаў на каленцах" — не новая. Яшчэ ў савецкія часы з падобным нумарам выступаў ансамбль фальклорнай музыкі пад кіраўніцтвам Уладзіміра Назарава. Менавіта адтуль пазычаны "фармат".

— У Інтэрнэце сёння можна пабачыць не толькі вашу віртуозную ігру на паленцах, але і іншыя ўнікальныя нумары…

— Сапраўды, ёсць у мяне яшчэ некалькі цікавых нумароў, напрыклад, "Сола на друкарскай машынцы" і "Люцічы". Пад час апошняга я выходжу на сцэну з барабанам і ў воўчай шкуры. Дэманструю гледачам, так бы мовіць, баявы мужчынскі танец, звязаны са старажытнымі абрадамі нашых язычніцкіх продкаў. Як вядома, татэмам у некаторых з беларускіх родаў быў вобраз ваўка. А мае "Люцічы" нібыта пераўвасабляюцца ў гэтага звера з дапамогай спецыяльных масак ды іншых атрыбутаў. Так яны запалохваюць сваіх ворагаў.

— Публіка, мабыць, у захапленні! Дарэчы, ці шмат давялося вам гастраляваць? Як вас прымаюць гледачы ў розных краінах свету?

— Прымаюць заўсёды цёпла і душэўна. З сольнымі музычнымі нумарамі выступаў амаль па ўсёй Еўропе, а таксама ў Бразіліі, Кітаі, Японіі, Паўднёвай і Паўночнай Карэі, Індыі. А мая мара: зладзіць цалкам сольную праграму са сваіх нумароў, зробленых у музычна-эксцэнтрычным жанры. Спадзяюся, калі-небудзь мне гэта ўдасца. Але для гэтага трэба яшчэ шмат працаваць і працаваць… Ва ўсялякім выпадку, абяцаю, што абавязкова запрашу "К" на свой мона-шоу-спектакль!..

К

Культура пачалася са…

…спадчыны

ТЭКСТ

Эдуард ЗАРЫЦКІ, кампазітар, народны артыст Беларусі:

— Дваццаць два гады працую ў Нацыянальным акадэмічным канцэртным аркестры. І як слушна заўважыў Міхаіл Фінберг, "…культура — гэта высокі прафесіяналізм".

Маё дзяцінства было бясхмарным, калі не браць да ўвагі памкненні бацькоў навучыць мяне граць на скрыпцы. Скажу шчыра, цярпець яе не мог. Але ў нашай сям'і паслухмянасць была традыцыяй, і я спраўна хадзіў у музычную школу.

Сыходзячы на працу, бацькі вызначалі мне час на вялікім напольным гадзіннику — граць "адсюль і дасюль". Бабуля завіхалася на кухні. Гамы і практыкаванні вымотвалі дашчэнту, і я смыкам пасоўваў стрэлкі ў той стан, калі экзекуцыя мела спыніцца.

Бабуля зазірала ў пакой і, зірнуўшы на гадзіннік, ускрыквала:

— Як хутка час праляцеў, а ў мяне яшчэ абед не гатовы!..

...Сусветна вядомы скрыпач Давід Ойстрах прыехаў у Мінск і выступіў у Доме афіцэраў. Маці павяла мяне, сямігадовага, на канцэрт. Мы сядзелі на пятнаццатым радзе.

Якім жа было маё здзіўленне: маэстра вадзіў смыкам па струнах скрыпкі гэтак жа, як і я!..

— Я таксама так умею! — заявіў я на ўсю залу. Тыя, што сядзелі побач, засмяяліся, а маці зашаптала:

—Так, сынок, як "ой — страх!" ты ўжо граеш…

Магчыма, з таго моманту я зразумеў, што скрыпка — гэта сур'ёзна.

Я яшчэ год правучыўся ў музшколе, а потым цалкам свядома заявіў:

— Можаце разбіць скрыпку аб маю галаву, але больш граць не буду!

Адсюль у маёй галаве загучала свая музыка. Потым была Кансерваторыя, клас прафесара Анатоля Багатырова. Маімі інструментамі былі фартэпіяна і акардэон. Пры Мінскай школе міліцыі я арганізаваў эстрадны аркестр, і мы выконвалі песні ў маёй аранжыроўцы. Напісаў і песню пра міліцыю. Тады мне выдалі форму.

Я быў худым, а форма вялікай, і міліцэйскія штаны я апранаў на свае. Пасля выканання маёй песні зала запатрабавала аўтара, а калі я падняўся з крэсла, штаны засталіся "сядзець"… Гледачы нічога не зразумелі, палічыўшы, што гэта трук.

Нас, студэнтаў, адпраўлялі "на бульбу". У той вёсцы мы жылі ў хаце дзеда, дзе не было радыё, а адзіны тэхсродак — магнітафон з навушнікамі. Памятаю, як дзед слухаў Першы канцэрт для фартэпіяна з аркестрам Чайкоўскага, а па яго няголеных шчоках цяклі слёзы… Так, музыку не тлумачаць, а адчуваюць.

Культура не можа прыйсці. Узровень адукацыі і ўзровень таленту несуадносныя з узроўнем культуры. Часта вызначэнне культуры трактуем павярхоўна, і павярхоўнае прымаецца за глыбіннае. У мастацтве ж важна быць, а не лічыцца.

Сапраўдная культура незаўважная ў чалавеку. Раскажу адну прыпавесць. Памірае мудрэц. Сабраліся людзі, каб пачуць ягонае апошняе слова. Сын схіліўся да яго твару і пачуў: "Жыццё — гэта рака…" Сярод прысутных пранеслася: "Рака…" — "Рака…" — "Рака…" І назад панеслася: "Якая?" — "Якая?" — "Якая рака?" Стары памаўчаў і прамовіў: "А можа, і не рака…"

Хэдлайн рэгіёна

Аксіёмы і рытарычныя пытанні?

Пад час размовы з Аляксандрам Зубко неаднойчы лавіў сябе на думцы аб тым, што беларусы маюць вялікія музычныя скарбы. Але вось ці ганарацца яны гэтым, ці карыстаюцца імі напоўніцу?

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Мабыць, даводзіць аксіёму пра тое, што беларуская музычная спадчына вельмі багатая, сёння нікому не патрэбна… Пачынаючы з часоў Вялікага Княства Літоўскага і заканчваючы днём сённяшнім многія таленавітыя музыканты, кампазітары, выканаўцы працавалі ды працуюць на папаўненне музычнай скарбонкі.

Але нельга не адзначыць, што гэтай скарбонкай вельмі мала карыстаюцца, асабліва на тэлебачанні. Ці часта сёння можна назіраць з экранаў тэлевізараў за выступленнямі аўтэнтычных фальклорных калектываў? Ці пабачыць, як майструюць ды граюць на лютні — спрадвечным беларускім музычным інструменце эпохі Сярэднявечча? А яшчэ — пабываць з дапамогай кінакамеры на канцэртах Івана Кірчука, "Старога Ольсы", іншых беларускіх музычных ансамбляў, якія маюць сваё непаўторнае гучанне, адрознае ад усюдыіснай папсы?..

Адказ на гэтыя, амаль рытарычныя, пытанні і не патрабуецца. Экраны сёння, як вядома, запаланіла менавіта яна, тая папса, якая і лёгка гучыць, і лёгка слухаецца. Мабыць, таму яна і патрэбная як тэлевізійшчыкам, так і нам, гледачам ды слухачам.

Так, нам, бо гэта мы яе выбіраем, яе слухаем, ёю захапляемся, забываючыся на тое, што ёсць іншая музыка, праверанная часам. Класічная, аўтэнтычная, сярэднявечная… Мудрая… Тая, якая і адрознівае нас, беларусаў, ад усіх іншых народаў, бо створана на нашай зямлі…

Слухаць яе, наталяцца ёю сёння, дзякуючы Інтэрнэту і запісам на дысках, можа кожны. Як і ганарыцца ёю, прапагандаваць ды патрабаваць, каб яна часцей гучала па радыё і тэлебачанні. Балазе скарбонка беларускіх музычных скарбаў заўсёды адкрытая для кожнага. А карыстацца апошнімі варта. Хаця б па адной той прычыне, што, як кажа народная мудрасць, "без мінулага няма і будучага"…

К

Выстаўка пра жыццё і дзейнасць 11-га Прэм'ер-міністра Дзяржавы Ізраіль **Арыеля Шарона** адкрыецца ў Нацыянальным гістарычным музеі 15 верасня.

Прага да Прагі: шпацыр па амаль горадзе-музеі

Адзін з будынкаў Нацыянальнага музея Прагі.

Адзін — на адзін "квадрат"

"Адзін музей на адзін квадратны метр!" Менавіта такі слоган, яўна разлічаны на заезджых і пераборлівых турыстаў з розных краін свету, я сустрэў у адным з рэкламных буклетаў, што бясплатна распаўсюджваюцца ў інфацэнтры Старой Прагі… Сапраўды, чаму б тут і не быць гэткім культурным установам у такой колькасці? Музеі ж тут сустракаюцца літаральна на кожным кроку.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

ЧЭХІЯ

Аўтограф ад Чапэка

Прага да Прагі жыла ўва мне, мабыць, яшчэ са школьнай лавы… Цалкам магчыма, што менавіта з таго часу, калі я ўпершыню даведаўся пра выданне кніг Бібліі ў далёкай, як тады здавалася, Чэхіі нашым першадрукаром Францыскам Скарынам. Прага здавалася для мяне, падлетка, нейкай "цудадзейнай краінай", у якой абавязкова трэба пабываць кожнаму. Чаму? Дык там жа, пэўна, яшчэ прыхаваўся ў кагосьці на гарышчы друкарскі станок, на якім наш знакаміты зямляк "са слаўнага града Полацка", рабіў адбіткі старонак Кнігі кніг. Там, на кніжных развалах і ў антыкварных крамах, можна яшчэ адшукаць "Біблію руску", як у свой час адшукаў яе ў Маскве другой паловы XIX стагоддзя Алесь Загорскі — герой аповесці Уладзіміра Караткевіча "Зброя"… Там — і ў гэта я таксама верыў дакладна — можна ўзяць аўтограф ды паспрачацца пра будучыню з пісьменнікам-фантастам Карэлам Чапэкам…

На жаль, завітаўшы ў Прагу ўжо ў рэальнасці, я так і не здолеў адшукаць ні Бібліі 1517 года выдання, ні ўзяць аўтограф ў Чапэка… Праўда, адшукаць тую-сюю даўнюю кніжку ў антыкварных крамах усё ж такі давялося, як і сустрэцца з цікавымі людзьмі, якія пераехалі ў сталіцу Чэхіі з Беларусі… А вось чаго не давялося — дык цалкам спатоліць сваю прагу да вандравання па пражскіх вуліцах, музеях ды галерэях… Дый наўрад ці для гэтага дастаткова дзесяці дзён падарожжа.

Да таго ж, любы старадаўні будынак у Празе — гэта помнік гісторыі, які можа пахваліцца тым, што ў ім бывалі ці жылі многія знакамітыя творчыя асобы. Да прыкладу, Вольфганг Амадэй Моцарт, чэшскія кампазітары Бедржых Сметана і Антанін Дворжак ды многія іншыя... Вось у гэтай кавярні, што носіць французскую назву "Montmartre", у міжваенныя часы месцілася багемнае кабарэ, заўсёднікамі якога былі Франц Кафка і Яраслаў Гашак, а тут, у рэстарацыі "Славія", напрыканцы 1980-х любіў адпачываць ды абмяркоўваць з сябрамі розныя літаратурныя, а пасля і палітычныя пытанні пісьменнік Вацлаў Гавал — будучы прэзідэнт Чэхіі…

Беларусы ў Празе

Шпацыруючы па старадаўняй Празе, я пастаянна ўяўляў сабе, як менавіта па гэтых вулках блукалі Францыск Скарына, а пазней, праз стагоддзі, — Уладзімір Жылка, Ларыса Геніюш ды Уладзімір Караткевіч… Здавалася, яшчэ хвіліна — і насустрач, вось з таго пакручастага брукаванага завулка, выйдзе беларускі першадрукар ці слынная паэтэса. Дарэчы, таго ж Скарыну можна "сустрэць" у Празе і сёння: помнік нашаму знакамітаму земляку знаходзіцца непадалёк ад Каралеўскага палаца і каралеўскіх жа садоў. І стаіць ён там зусім нездарма: як вядома, славуты палачанін быў не толькі першадрукаром Бібліі, але і садоўнікам… А яшчэ ў адным з раёнаў Прагі — Клеменцінуме — сёння вісіць мемарыяльная дошка ў гонар першай старабеларускай друкаванай кнігі, якая пабачыла свет у Празе ў 1517 годзе.

Мемарыяльная шыльда Францыску Скарыну ў Празе.

Ёсць у чэшскай сталіцы і Альшанскія могілкі, дзе знайшлі спачын многія беларусы. Бо не сакрэт, што ў 1920-я гады менавіта сюды, у Прагу, перабраўся і тут дзейнічаў Урад Беларускай Народнай Рэспублікі. Магілы яе кіраўнікоў Пётры Крачэўскага і Васіля Захаркі, як і месца апошняга спачыну вядомага песняра Міхася Забэйды-Суміцкага, сёння можна адшукаць менавіта на тых кладах…

Нядаўна ў адным з раёнаў чэшскай сталіцы, на вуліцы Новавысачанскай, адкрылася і беларуска-моўнае кафэ, дзе можна замовіць дранікі ды іншыя стравы нашай нацыянальнай кухні. А калі загаварыць з афіцыянтамі на матчынай мове, дык атрымаеш зніжку ў дзесяць працэнтаў на ўсе замоўленыя стравы…

Музейныя музы

Але вярнуся да музеяў. Бо Прага — адна са знакамітых музейных сталіц Еўропы. І называюць яе гэтым пачэсным тытулам зусім нездарма, бо тут налічваецца больш за 70 розных музеяў ды 160 мастацкіх галерэй, якія разлічаны, як кажуць, на любы густ. Пра ўсе з іх расказаць не ўдасца, ды гэта, мабыць, і не трэба. Спынюся толькі на некалькіх.

Напрыклад, калі нехта зачараваны даўніной і сярэднявечнымі матывамі, дык раю яму абавязкова пабываць у Мастацкай галерэі Пражскага града. Тут размешчана калекцыя імператара Рудольфа II, аднаго з найбуйнейшых збіральнікаў твораў мастацтва свайго часу, што меў палотны такіх майстроў, як Рубенс і Тыцыян. Дарэчы, кожны панядзелак уваход у гэтую галерэю — вольны. Праўда, вельмі нядоўга: з 16 да 18 гадзін… Так што лепш за ўсё набыць білет у звычайны дзень (за 150 крон (гэта прыкладна 75 тысяч рублёў)…

Мяне вельмі ўразіла тое, што ў Празе нямала мясцін, звязаных з памяццю аб агульным савецка-чэшскім сацыялістычным мінулым. І, як вядома, не заўсёды яно, тое сужыццё, было шчаслівым. Таму, шпацыруючы па Празе, можна шмат дзе ўбачыць помнікі ахвярам сталінізму і камунізму ды культурныя ўстановы адпаведнай тэматыкі: Музей Халоднай вайны, Музей камунізму і Музей КДБ. Апошні быў адкрыты не так даўно, у 2011 годзе. У ім аднаўлена абстаноўка будынка Камітэта дзяржаўнай бяспекі СССР: кабінеты супрацоўнікаў, тэлефонныя апараты, канцылярскія прылады, знакі адрознення агентаў савецкай спецслужбы. Акрамя таго, прадстаўлены асабістыя рэчы першых асоб Савецкага ўрада. Да прыкладу, радыёпрыёмнік з асабістага кабінета Берыі…

К

Працяг шпацыру па музеях Прагі чытайце **ў бліжэйшых нумарах "К".**

Нататкі музейшчыка пра скарбніцы Сербіі

Крэпасць у Бялградзе.

Бялградскія… джэдаі

Першае ўражанне ад Сербіі: краіна, якая засталася ў мінулым — магчыма, у 1990-х. Але, пазнаёміўшыся бліжэй з культурай, традыцыямі, гістарычнай спадчынай, адразу разумееш: гэта зямля з асаблівым вобразам, з трапяткім стаўленнем да сваёй гісторыі, дзівоснай прыродай, багатай культурай. "Сэрца" паўднёва-ўсходняй Еўропы, радзіма шаснаццаці рымскіх імператараў, краіна, што за апошняе стагоддзе змяніла восем назваў…



Сяргей ГАНЧАР, дырэктар Вілейскага краязнаўчага музея

ТЭКСТ

СЕРБІЯ

Сталіцу Сербіі — Бялград — некаторыя называюць адной з самых "савецкіх" сталіц Еўропы. Безумоўна, свой адбітак пакінуў нялёгкі лёс колішняй Югаславіі. І ўсё ж Бялград цікавы, і ў сваёй незвычайнасці ён вельмі натуральны.

Безумоўна, знакавай славутасцю Бялграда з'яўляецца найстарэйшая турэцкая крэпасць Еўропы — Калемегдан, што ўзвышаецца ў цэнтры горада, акурат у месцы зліцця рэк Дунай і Сава, ды мае шматвяковую ды вельмі заблытаную гісторыю. Да ўсяго, Калемегданам называецца парк побач з фартэцыяй. Напэўна, не было ніводнай вайны на Балканах, дзе ні задзейнічалі бялградскую крэпасць. Асноўная яе частка пабудавана напрыканцы XVII — у XVIII ст., аднак ёсць значна больш старажытная (каля XV ст.) частка, а многія пабудовы, у тым ліку тыя, якія падаюцца даволі старадаўнімі, з'явіліся ў XX ст. Дзякуючы беламу каменю, што паслужыў матэрыялам для сцен і вежаў, крэпасць атрымала яшчэ і назву Бялград (літаральна — "Белы горад"). Зараз тут — парк ды музеі. На беглы агляд неабходна пара гадзін, а на больш дэталёвы (уключаючы Ваенны музей) — мінімум паўдня. У апошнія гады тэрыторыя крэпасці актыўна рэстаўруецца і становіцца ўсё больш камерцыйна-арыентаванай на масавага турыста. Аднак засталіся там і сапраўдныя адвечнасць ды натуральнасць.

Адным з найцікавых з'яўляецца Ваенны музей з вялікай калекцыяй тэхнікі. Экспазіцыя на адкрытым паветры разгарнулася паміж сцен крэпасці і даступная для вольнага агляду. Тут прадстаўлена ўзбраенне Францыі, Англіі, Германіі, СССР з канца XIX стагоддзя і да Другой сусветнай вайны ўключна. Ёсць таксама знакамітыя савецкія "кацюшы" і танк Т-34. Уласна будынак музея ў форме замка быў узведзены ў 1929 годзе і глядзіцца вельмі эфектна.

Па галоўнай вуліцы горада, названай у гонар князя Міхаіла, якая з'яўляецца пешаходнай і гандлёвай зонай, у Верхні горад крэпасці можна ўвайсці праз Стабульскія і Гадзіннікавыя вароты, а ў Ніжні — праз вароты Відзін і Змрочныя. У межах крэпасці таксама знаходзіцца галерэя Музея прыродазнаўства, будынак упраўлення аховы помнікаў культуры, узведзены ў XIX стагоддзі для патрэб сербскага войска, заапарк і старадаўнія святыні. На аглядавай пляцоўцы месціцца помнік Пераможцу работы скульптара Івана Мештровіча, што ўстаноўлены ў 1928-м у гонар 10-годдзя прарыву Салунікскага фронту. Непадалёк знаходзіцца і Рымскі калодзеж глыбінёй у 60 метраў. У яго можна спусціцца па вінтавой лесвіцы на глыбіню да 35 метраў.

Крэпасць уражвае і прыемна здзіўляе на кожным кроку: то цудоўны парк, то вайсковая тэхніка, то тэнісныя корты ці футбольнае поле паміж сценамі — так выкарыстоўваюць пустуючыя плошчы. Музеі — невялічкія, але вельмі насычаныя ў плане экспанатаў ды інтэрактыву.

Так, апынуўшыся ў Бялградзе, абавязкова трэба зазірнуць у Музей Ніколы Тэсла. У ім прадстаўлены розныя прыборы, схемы і асабістыя рэчы вынаходніка. Музей невялікі, але вельмі пазнавальны ды цікавы. Ён складаецца з дзвюх частак: пастаяннай навуковай экспазіцыі і часовай (зменнай), прысвечанай асабістаму жыццю вучонага. Тут таксама паказваюць 20-хвілінны фільм аб жыцці і працы Тэсла.

У навуковай экспазіцыі экскурсавод музея дэманструе некаторыя эксперыменты, якія ілюструюць дзейнасць і досведы навукоўца. На інтэрактыўнай экскурсіі можна апрабаваць катушку, названую імем фізіка, — адну з самых вядомых яго вынаходак. Можна атрымаць рознакаляровыя маланкі адным толькі дотыкам да гэтага цуду інжынернай думкі. Альбо — адчуць сябе… джэдаем, дакрануўшыся да люмінесцэнтнай лямпы, якая імгненна загарыцца без усякіх правадоў…

Крыху засмуціў Музей народнага мастацтва, бо ў галоўнай частцы яго ідзе рамонт, а астатнія залы не вельмі ўражваюць…

Што ж да перыферыйных музеяў, дык яны таксама цікавыя і збольшага прадастаўляюць наведвальнікам інтэрактыўныя экскурсіі. Амаль кожны музей мае свае (ці размешчаныя паблізу) "пазаштатныя" сувенірную краму і кафэ, рэстаран, дзе можна адпачыць ды пакаштаваць выключна нацыянальную кухню.

Бялград у параўнанні з раскручанымі Прагай, Будапештам або Дуброўнікам мае непаўторнае аблічча. Сербія ж вартая таго, каб яе пазнавалі і ўспрымалі як адзінае цэлае. А галоўнае — там кожны адкрые для сябе шмат таямніц…

Выстаўка сценапісу адкрылася ў Мастацкай галерэі Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

Яркай каметай уварваўся гэты мастак у другой палове XX стагоддзя ў беларускі жывапіс. З кім яго параўнаць? Няма з кім. Так і стаіць ён асобна — не падобны ні на кога, самабытны, незалежны ад чужых меркаванняў, палка адданы сваім ідэалам, якія вызнаваў усё жыццё… Акурат 20 гадоў таму, 4 жніўня 1994-га, пайшоў з жыцця гэты жывапісец, чый талент і да сённяшняга дня яшчэ не атрымаў той вартай ацэнкі, якую па праве заслужыў сваім незвычайным мастацтвам.

Ізраіль Басаў.

Барыс КРЭПАК

Ізраіль Басаў: вечны шлях, які не мае канца…

Адзінота даўжынёй у жыццё

Ізраіль Басаў. "Каханне".

Гаворка — пра Ізраіля Басава. Праўда, напрыканцы 1990-х — на пачатку 2000-х лёд нібыта крануўся: былі выдадзены два сціплыя альбомы пра творчасць мастака, на жаль, невялічкім тыражом, якія даўно сталі бібліяграфічнай рэдкасцю. У напісанні тэкстаў прымалі ўдзел мастацтвазнаўцы Мікола Пагрануўскі, Вольга Капёнкіна, Нінэль Зітарава (Талін) і Ларыса Фінкельштэйн. Што і казаць, гэтыя спецыялісты, сур'ёзныя, думаючыя, адданыя мастацтву, зрабілі важны крок ва ўвекавечанні памяці слыннага жывапісца, дый пасмяротныя выстаўкі яго твораў (у Нацыянальным мастацкім музеі ў 1996-м, а потым — яшчэ праз два гады) прымусілі інтэлектуальнае грамадства адкрыць вочы на такую, як аказалася, мала вядомую шырокай грамадскасці з'яву, як "дзіўны жывапіс" Ізраіля Басава.

Але ўсё гэта было пасля смерці жывапісца. Пры жыцці яму так і не ўдалося хоць трошкі зведаць славу мастака-наватара, які, насуперак тагачаснаму негатыўнаму стаўленню да яго з боку большасці калег, рабіў сваю справу сумленна, практычна, у поўнай адзіноце, не думаючы пра нейкія матэрыяльныя выгоды, узнагароды, дагаворы, закупкі карцін, самарэкламу і г.д. Лёс быў трагічна бязлітасны да яго. Пры жыцці Басаў не паспеў зладзіць ніводнай сваёй персанальнай выстаўкі з прычыны абсалютнай індыферэнтнасці як з боку афіцыйных структур, так і нашага мастацтвазнаўства. Нават у шасцітомнай "Гісторыі беларускага мастацтва" Леанід Дробаў, разважаючы пра жанры беларускага пейзажа і партрэта, ніводнага разу не згадаў ягонае імя!..

Памятаю, як радаваўся Басаў, калі ў 1968 годзе ў адным з артыкулаў у "Ліме" я прысвяціў ягонай карціне "Успаміны" вялікі фрагмент!.. І хто б мог падумаць, што ў такога неабароненага чалавека, якім быў Басаў, знойдуцца сілы для папраўдзе мужнага змагання супраць незразумелага стаўлення людзей! Я нібыта сёння чую ягоны крыху глухаваты голас, бачу мяккую збянтэжаную ўсмешку, задуменны твар, у якім унутраная чалавечая сціпласць і незалежнасць мастакоўскіх поглядаў спалучаліся з дзіўнай прастадушнасцю…

Амаль штодня, раніцай, Басаў падымаўся да сябе ў майстэрню і станавіўся да мальберта. Я тады — у 1960-я — часта заходзіў да яго і гадзінамі разглядаў ягоныя, непадобныя не на чые, творы. А бывала, і назіраў чароўны працэс работы над такімі палотнамі, як "Акно", "Рытм горада", "Спатканне". І "Аўтапартрэт" ён пісаў таксама на маіх вачах. У асноўным творы былі прысвечаны Мінску ды яго самотным жыхарам, якія бачыліся мастаку нібы праз прызму сумнай мелодыі. А карціны "Успамін", "Гарадская ўскраіна", "Рытм горада" і "Вуліца Чырвонаармейская" падаліся мне тады шэдэўрамі. Яны і зараз — шэдэўры беларускага, а можа, і еўрапейскага жывапісу, поўныя глыбокага філасофскага роздуму пра хуткаплыннасць часу…

Мне здавалася, што Басаў заўсёды жыў у свеце таямнічых мар, якія ён нікому не расшыфроўваў. І душа ў мастака была на дзіва далікатная, хаця і наглуха закрытая для тых, хто быў для яго чужым. Усе сілы ён скіроўваў у адно рэчышча, туды ж выпраменьваліся ўсе токі яго сэрца — у творчасць. Гэта галіна, дзе не выдаюць узнагарод за подзвіг штодзённай працы. Дый не чакаў Басаў гэтых узнагарод, не праяўляючы намаганняў ці запалу для таго, каб вызначыцца, праславіцца, паўстаць не тым, кім быў насамрэч. Ён заставаўся сціплым, чуйным, негаваркім рабацягам, і у той жа час — балюча-чуллівым. Хітраваць, цямніць, скарыстоўваць абходны манеўр — усё гэта ў зносінах з ім было марнымі высілкамі. Гаварыць трэба было проста, шчыра і па магчымасці — з максімальным трапляннем у цэль. І тады вочы жывапісца ўспыхвалі, калі мне ўдавалася дакладна вытлумачыць сэнс карціны, адкрыць у ёй тое патаемнае, схаванае, самабытнае, што ён уклаў у палатно…

Басаў лічыў, што мастаком ён стаў ужо ў сталым узросце, калі "сфарміраваўся як чалавек", — тое, што маляваў пасля вучылішча і пазней, калі нейкі перыяд працаваў на мастацка-вытворчым камбінаце Мастацкага фонду БССР (было і такое), — не лічыцца. "Тыя ранішнія творы, намаляваныя, галоўным чынам, з натуры, — казаў ён, — я нават не падпісваў, бо не верыў у тое, што пішу. А калі зразумеў, што, уласна кажучы, "на натуры" наперад рушыць не змагу, справа пайшла, як трэба… І ніколі не думаў пра нейкі "авангардызм", "андэграўнд", "кубістычны экспрэсіянізм" і г.д., куды мяне не раз упісвалі крытыкі ды розныя "дабрадзеі"…"

Аднак, па праўдзе кажучы, у кулуарах (на жаль, толькі ў кулуарах) і тады пра Басава казалі шмат добрага, лічачы яго сапраўды таленавітым ды своеасаблівым жывапісцам. Асабіста я чуў такое меркаванне ад ягоных былых аднакурснікаў па Мінскім мастацкім вучылішчы Леаніда Шчамялёва, Мая Данцыга, Міхаіла Чэпіка, а таксама Аляксандра Кішчанкі і Уладзіміра Стальмашонка. Кішчанка, напрыклад, лічыў Басава адным з адкрывальнікаў у беларускім жывапісе так званага закону элементаў…

К

Заканчэнне аповеду пра Ізраіля Басава — **у наступных нумарах "К".**

Мінск з вышыні

Фатограф Цімафей Ізотаў — калісьці мінчанін, а сёння масквіч — адсканаваў свае старыя здымкі, зробленыя ім яшчэ ў школьныя гады. Кропкі здымак большасці гэтых кадраў — з даху высоткі па-за гандлёвым домам "На Нямізе" і гасцініцы "Беларусь", будаўніцтва якой тады было замарожана. Сёе-тое знята ў Траецкім прадмесці, якое толькі-толькі адрэстаўравалі. Гэта Мінск, дзе яшчэ не пабудавана другая лінія метро, існуе шэраг будынкаў XX стагоддзя, пра якія сённяшняе пакаленне мінчан, бадай, і не ведае.

Сяргей ТРАФІЛАЎ



МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:
- Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.
- Мастацтва Беларусі XIX — пач. XX стст.
- Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.
- Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.
- Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.

Выстаўкі:
- Выстаўка мужчынскага касцюма і кунтушовых паясоў з прыватнага збору **"Залататканы шоўк, бясцэнны па рабоце..."** — да 31 кастрычніка.
- Арт-праект сучасных мастакоў **"Zabor"** — да 3 кастрычніка.
- Выстаўка **"Рускі акадэмізм. Жывапіс XIX ст. са збору Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі"** — да 6 кастрычніка.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-й ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.

Пастаянныя экспазіцыі:
- "Інтэр'еры шляхецкай сядзібы".
- "Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча".
- "Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".

Выстаўка:
- **"Падарожныя замалёўкі Кануція Русецкага"** — да 30 верасня.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 68.
- Пастаянная экспазіцыя.

Выстаўка:
- Выстаўка **"Самабытныя вобразы сучаснасці"** — да 25 кастрычніка.

МУЗЕЙ В.К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў Г. МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37.
Тэл.: (8–0222) 22 48 87.
- Экспазіцыя **"Культура 1-й пал. XIX ст.".**

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 327 43 22.

Экспазіцыі:
- **"Старажытная Беларусь".**
- **"Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".**
- **"Банк БелВЭБ: новае жыццё нацыянальных скарбаў".**

Выстаўкі:
- Міжнародны праект **"Рэчы паміж жыццём і смерцю"** — да 14 верасня.
- Выстаўка **"О доблестях, о подвигах, о славе"** — да 21 верасня.
- Выстаўка **"Музей шакаладу "Nikolya"** — да 9 лістапада.
- Выстаўка **"Беларусы замежжа"** — да 19 верасня.
- Выстаўка, прысвечаная жыццю і дзейнасці 11-га Прэм'ер-міністра Дзяржавы Ізраіль **Арыеля Шарона,** — да 19 верасня.

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДА РСДРП

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а.
Тэл.: 290 68 47.
- Пастаянная экспазіцыя.

Выстаўка:
- **"Кубак Чапскага"** (прымеркавана да дня нараджэння Карла Чапскага) — да 20 верасня.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02; + 37529 551 80 51, +37529 190 31 49.

Палацавы ансамбль
- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстаўка **"Падарожжа з Нясвіжа ў Парыж"** — да 21 верасня.
- Выстаўка люлек **"Прадмет годнага адпачынку"** — да 30 верасня.

Ратуша
- Пастаянная экспазіцыя.

Інфармацыйна-касавы цэнтр
- Выстаўка фота **"Смак беларускай гісторыі"**.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 91, (8–01596) 2 82 70.
- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстаўка фатаграфій **"Мір стары — Мір новы".**
- Выстаўка **"Першая сусветная вайна ў гісторыі адной сям'і"** — да 1 кастрычніка.
- Выстаўка **"Даспехі Заходняй Еўропы XVI — XVIII стст."** — да 30 верасня.

Партрэтная зала
- Выстаўка **"Партрэты князёў Радзівілаў з калекцыі князя Канстанціна Гагенлоэ"** (Германія) — да 16 лістапада.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.
Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыя:
- **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць".**
- Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра".**
- Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам для школьнікаў малодшага ўзросту.
- Музейна-педагагічны праект **"Крочым у школу разам з Коласам".**

Акцыі:
- **"Самы лепшы дзень"** (Дзень нараджэння ў музеі).
- Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"** (па папярэдняй дамоўленасці).
- Музейная творчая майстэрня (майстар-клас па вырабе цацак з салёнага цеста).

Выстаўкі:
- Выстаўка да 105-годдзя з дня выхаду ў свет зборніка Якуба Коласа **"Другое чытанне для дзяцей беларусаў".**

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.
Тэл.: 327 78 66.

Экспазіцыя:
- Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.
- Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі", "Вячоркі"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.

Выстаўка:
- Выстаўка з нагоды Юбілею Музея Янкі Купалы **"Майго жыцця бясмертны цень"** — з 19 верасня да 17 кастрычніка.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10.
- **"Back in BSSR / Ізноў у БССР"** (савецкі плакат 1940 — 1980-х гг., прадметы матэрыяльнай культуры).
- Выстаўка скульптуры Ўладзіміра Жбанава **"Ад мяне"**.

Філіялы Музея гісторыі горада Мінска

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА

г. Мінск, пл. Свабоды, 15.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:
- **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт".**
- **"Мастак. Грамадзянін. Герой".** Прысвечана Герою Беларусі, народнаму мастаку Беларусі, Ганароваму грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.

Выстаўкі:
- Фотавыстаўка Міхаіла Маруга **"Нашы любімыя".**
- Выстаўка Зоі Луцэвіч **"Водар кахання"** — да 5 кастрычніка.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША

г. Мінск, пл. Свабоды, 2а.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:
- **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет".**

Выстаўка:
- Выстаўка **"Gloria Patria"** — дакументы, карты, прадметы хрысціянскага культу з прыватнай калекцыі Ігара Сумрачэўскага.

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 18. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:
- "Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж".
- Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10.
Тэл.: 285 18 86.

Экспазіцыя:
- **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры к. XIX — с. XX стст.

Выстаўка:
- **"Куфэрак: стагоддзе прыгажосці"** — рэканструкцыя касцюмаў XIX ст.

ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА

г. Мінск, пр-т Ракасоўскага, 49.
Тэл.: 291 16 76.

Экспазіцыі:
- **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Л.Шчамялёва".**

Выстаўка:
- Даследчы выставачны праект **"Дыялог эпох. Інтэрпрэтацыі"** — да 10 кастрычніка.

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4.
Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца

Выстаўкі:
- Выстаўка **"Музей шакаладу "Nikolya"** — да 26 кастрычніка.
- **"Цмокі і васковыя фігуры"** (скульптуры драконаў і герояў фэнтазі, а таксама гістарычныя персанажы царскай сям'і Раманавых) — да 16 верасня.
- Фотапраект **"Алеямі Гомельскага парку"** — да 5 кастрычніка.

Экспазіцыі:
- **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
- **"Загадкавыя фантазіі мора"** (грот палаца).
- Экспазіцыя, прысвечаная дзяржаўнаму дзеячу СССР А.Грамыку.
- **"Чырвоная гасцёўня".**
- **"Зала ўрачыстых прыёмаў".**
- Экспазіцыя адкрытага захавання археалагічнай калекцыі музея (цокаль паўднёвай галерэі).
- **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).

Вежа палаца

Экспазіцыя:
- **"Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы".**

Выстаўкі:
- **"Кнігі, у якіх захоўваецца час..."** (лепшыя выданні сяр. XVII — пач. XX стст.) — да 1 кастрычніка.
- **"І рай, і боль на Песеннай зямлі..."** (графіка беларускіх мастакоў 1920 — 1930-х) — да 14 верасня.

Паўночнае крыло палаца

Экспазіцыя:
- **"Свет звяроў Гомельшчыны".**

Выстаўкі:
- Куток жывых экзатычных рэптылій.

Зімовы сад

Свет субтрапічных раслін і жывёл.

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5.
Тэл.: (8-0232) 77 57 41.
- Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
- Пастаянная выстаўка тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
- На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.
- **"Музей крыміналістыкі".**
- Лакальная экспазіцыя **"Ваенна-санітарны вагон".**
- Выстаўка з Бранскай універсальнай бібліятэкі імя Ф.Цютчава **"Дарогамі вайны"** — 16 кастрычніка.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а. Тэл.: (8-0154) 53 50 64.
- Экспазіцыя **"Прырода Лідчыны".**

Выстаўкі:
- **"Вядзём пачатак свой ад Гедыміна...".**
- **"Прадметы побыту к. XIX — пач. XX стст.".**
- Выстаўка адной карціны **"Партызаны".**
- **"Прывітанне, ранейшая Ліда!".**
- **"Музейна-вобразная зала "Хрушчоўка-60".**
- Турыстычна-пазнаваўчая праграма **"Праз вякі, праз стагоддзі"** ў Лідскім замку.
- **"Крылы над Лідай"** — выстаўка да 100-годдзя Лідскага аэрадрома.
- Выстаўка **"Як жылі нашы продкі".**
- Выстаўка **"Чарадзейны Куфар".**
- Выстаўка творчых работ выпускнікоў і выкладчыкаў мастацкай школы **"Сустрэча пакаленняў".**
- Персанальная выстаўка П.Цімафеева **"Драматычнасць сярэдняга плана. Час жывых".**
- У рамках праекта "Выток Нёмана — выток духоўнасці" — калектыўная выстаўка **"Абуджэнне".**
- Выстаўка дэкаратыўна-прыкладной творчасці А.Чуўюравай (Сярко) **"Частка маёй душы".**
- **"Вайны свяшчэнныя старонкі"** — выстаўка, прысвечаная Вялікай Перамозе.
- Выстаўка **"Старонкі непа-100ронняй Вялікай вайны на Лідчыне".**

ЛІДСКІ ЗАМАК

- Камера катаванняў.
- Фотавыстаўка **"Захаваем на вякі".**
- Партрэтная галерэя вялікіх князёў і каралёў.
- Фотавыстаўка **"Археалагічныя знаходкі Лідскага замка".**
- Выстаўка рэплік **"Зброя Вялікага Княства".**

ГАЛЕРЭІ

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3.
Тэл./факс.: 288 15 49.
- **"Вялікі модны маркет"** — 13 — 14 верасня.
- Кірмаш рамёстваў **"StARTup"** (выстаўка працуе з 15.00 да 21.00) — з 15 да 18 верасня.

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1.
Тэл.: 327 26 12.
- Выстаўка твораў Ганны Сілівончык **"Шыварат-навыварат"** — з 19 верасня.
- Графіка польскага мастака **Януша Акермана** — з 19 верасня.

Аб'ява!*

СТЫПЕНДЫЯЛЬНАЯ ПРАГРАМА МІНІСТРА КУЛЬТУРЫ І НАЦЫЯНАЛЬНАЙ СПАДЧЫНЫ РЭСПУБЛІКІ ПОЛЬШЧА "GAUDE POLONIA"

Нацыянальны цэнтр культуры аб'яўляе конкурс на атрыманне стыпендыі на шасцімесячны курс навучання ў Польшчы ў рамках стыпендыяльнай праграмы Міністра культуры і нацыянальнай спадчыны Рэспублікі Польшча "Gaude Polonia".

Праграма "Gaude Polonia" прызначана для маладых творцаў і перакладчыкаў з краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.

Курс навучання ў Польшчы пачнецца 1 лютага і будзе доўжыцца да 31 ліпеня 2015 года. Набор удзельнікаў ажыццяўляецца на конкурснай аснове. Кандыдаты павінны валодаць польскай мовай на базавым узроўні. Заяўкі прымаюцца **да 15 кастрычніка 2014 года**.

Неабходныя дакументы:

— заява на атрыманне стыпендыі;
— мінімум 2 рэкамендацыі ад вядомых у дадзенай галіне творцаў;
— партфоліа (у папяровым выглядзе ці на CD).

Заявы можна падаваць у Польскі Інстытут у Мінску або непасрэдна ў Нацыянальны цэнтр культуры.

Падрабязную інфармацыю аб Праграме і бланкі анкет можна атрымаць на інтэрнэт-старонцы
http://www.nck.pl/kategorie/gaudepolonia.html
і ў Нацыянальным цэнтры культуры ў Варшаве
(тэл.: +48 22 210 01 21; e-mail: bogumila.berdychowska@nck.pl),
а таксама ў Польскім Інстытуце ў Мінску
(Мінск, вул. Валадарскага, 6; тэл.: (8017) 200-63-78, (8017) 2009581).

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1. Тэл./факс: 334 11 56.
- **14 — "Рыгалета"** (опера) Дж.Вердзі.
- **15** — Вечар балета **"Са стагоддзя XIX у стагоддзе XXI"** ("Па-дэ-карт", "Свята кветак у Чынзана", "Па-дэ-пасіс з балета "Эсмеральда", "Серэнада", "Шэсць танцаў"). Пачатак а 19-й.
- **15 — "Тэнары супраць басоў"** — Музычныя вечары ў Вялікім (Камерная зала імя Л.П. Александроўскай). Пачатак у 19.30.
- **16 — "Яўгеній Анегін"** П.Чайкоўскага.
- **17 — "Тамар"** (балет у адной дзеі) М.Балакірава; **"Шахразада"** (балет у адной дзеі) М.Рымскага-Корсакава.
- **18 — "Турандот"** (опера ў 3-х дзеях) Дж.Пучыні.
- **19 — "Анюта"** (балет у 2-х дзеях) В.Гаўрыліна.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7.
Тэл./факс: 327 60 81.
- **14 — "Чорная панна Нясвіжа"** А.Дударава.
- **16 — "Хам"** Э.Ажэшка.
- **17 — "Translations"** Б.Фрыла.
- **18 — "Сымон-музыка"** Якуба Коласа.
- **19 — "Пінская шляхта"** В.Дуніна-Марцінкевіча.
- **20 — "Пан Тадэвуш"** А.Міцкевіч.

На Малой сцэне Канцэртнай залы "Мінск"
- **13 — "Самотны захад"** МакДонаха.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44.
Тэл./факс: 334 60 08.
- **15 — "Адамавы жарты"** С.Навуменка.
- **16 — "Нязваны госць"** С.Бартохавай.
- **17 — "Сталіца Эраўнд"** С.Гіргеля.
- **18 — "Белы анёл з чорнымі крыламі"** Д.Балыка.
- **19 — "Ліфт"** Ю.Чарняўскай.
- **20 — "Нязваны госць"** С.Бартохавай.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44.
Тэл.: 200 81 26.
- **14 — "Залатое кураня"** У.Уланоўскага.
- **14 — "Блакітная камея"** (спектакль ідзе без аркестра) К.Брэйтбурга.
- **15 — "Граф Люксембург"** (аперэта ў 2-х дзеях) Ф.Легара.
- **16 — "Праўдзівая гісторыя паручніка Ржэўскага"** В.Баскіна.
- **17 — "Соф'я Гальшанская"** У.Кандрусевіча. Пачатак а 19-й.
- **18 — "Тысяча і адна ноч"** Ф.Амірава.
- **19 — "Бабін бунт"** Я.Пцічкіна.
- **20 — "Дуброўскі"** К.Брэйтбурга.